КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 30 (1156) 26 ліпеня 2014 г.

Усе студэнцкія дыпломы: агляд і высновы С. 4 — 5

Куды рушаць **тэатральныя "пастары"** С. 6

А.М., М.М. ды невядомы Шырма С. 7

Дарога культработніку — **у гіпермаркет?** С. 10 — 11

8-міліметровыя гісторыі пра нашу гісторыю С. 14 — 15

Лінія абароны каля вёскі Пасынкі Мядзельскага раёна. / Фота Андрэя МАЦУРА

ПОГЛЯД ПРАЗ СТАГОДДЗЕ

Газета "Культура" прыгадвае сёння падзеі Першай сусветнай вайны, полымя якой разгарэлася 28 ліпеня 1914 года. Фотаматэрыял у нумары дазволіць паглядзець на тыя мясціны Беларусі, дзе доўгі час стаяла лінія фронту, як вачыма салдат пачатку XX стагоддзя, так і неабыякавых сучаснікаў на пачатку стагоддзя XXI-га.

С. 2 — 3, 14

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Праекты развіцця

"О божа, які..." самаакупны?

Ужо другі раз Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" прайшоў у новым фармаце. Сёлета яго новаўвядзенні сталі больш заўважнымі, бо закранулі не толькі знешні антураж фестывалю — разнастайныя "спадарожныя" імпрэзы, але і сам ягоны змест — тыя мерапрыемствы, што раней лічыліся асновай асноў. Ці стаў ад гэтага фестываль больш гарманічным?

Надзея БУНЦЭВІЧ
Мінск — Віцебск — Мінск

Развітанне не для "Славянкі"

Хай не пакрыўдзяцца арганізатары, але калі ў мяне пытаюцца, ці стаў "Славянскі базар..." лепшым, чым быў, я адказваю: "Не". Магчыма, гэта суб'ектыўны погляд, але, улічваючы аб'ектыўныя заканамернасці... Само словазлучэнне "новы фармат" сведчыць, што фестываль уступіў у чарговы "пераходны ўзрост", наноў пераацэньваючы здабыткі. А ў час "перабудовы" ды іншых "рамонтна-аднаўленчых работ" даводзіцца жыць надзеяй: маўляў, "заўтра будзе лепш, чым учора".

Адначасова, рэформы, якія пачаліся, — паказчык таго, што фестывалю рана слухаць хор "добразычліўцаў": "Баю-бай..." Наша "Славянка", як любоўна называюць форум у кулуарах, імкнецца да пераўвасаблення. А гэта больш складана, чым нараджэнне новага свята. На гэтым шляху можа сустрэцца колькі заўгодна калдобін — важна, каб ён пракладаўся ў патрэбным кірунку.

Што ж, асноўны вектар далейшага развіцця "Славянскага базару..." найлепшым чынам адпавядае задачам фестывальнага руху ўвогуле: сябе паказаць і на іншых паглядзець. Шчыра кажучы, так было з заснавання форуму, толькі "сваё" заставалася дзесьці на перыферыі, а пад "іншымі" разумеліся найперш былыя савецкія рэспублікі і краіны былога сацыялістычнага лагера. Пашырэнне кола ўдзельнікаў з далёкага замежжа і нават з іншых кантынентаў пачалося насамрэч даўно, толькі падносілася больш сціпла. Выхад за межы ўласна славянскіх народаў таксама пачаўся не сёння, і ён цалкам заканамерны. Дык чаго ж не хапае? Эстэтычнай платформы. Разумення таго, што такое добра і што такое дрэнна — менавіта ў мастацкім сэнсе. І перашкаджае гэтаму не столькі кірунак на самаакупнасць, як прынята лічыць, колькі густы публікі. А яшчэ больш — глядацкая інерцыя, прычына якой — у мэтавай аўдыторыі фестывалю, якая і дагэтуль не вызначана канчаткова. Фэст, быццам дзяўчо з заніжанай самаацэнкай і марай пра заморскага прынца, імкнецца спадабацца адразу ўсім. Псіхолагі ў такіх выпадках раюць заставацца самім сабой. Ці, калі ўласнае "Я" пакуль не вызначана, паспрабаваць "прымерыць" некалькі розных абліччаў-іміджаў, каб знайсці сваё. Тое ж адбываецца і з фестывалем, толькі працэс пошуку стрымліваецца інфраструктурай.

Галоўны боль — напоўніць Амфітэатр, які па колькасці гледачоў пераўзыходзіць іншыя пляцоўкі горада, разам узятыя. Ну што з таго, калі білеты на "Брэменскіх музыкаў" у тэатры "Лялька" разышліся адразу? Зала там — на якую сотню месцаў. Іншая справа — Амфітэатр, дзе больш за шэсць тысяч месцаў і кошт на білеты, здараецца, перавальвае за мільён. Адпаведна, стрыжнем "Славянскага базару..." становяцца падзеі на гэтай сцэне. І што ж мы там бачым? Пераважна — расійскую эстраду. Узнікаюць паралелі з 1990-мі, калі фестываль яшчэ толькі пачынаўся ды атрымліваў безліч заўваг і наконт назвы, і наконт праграм, складзеных з "учарашняга дня" расійскай мас-культуры.

Грошы як ідэя?

Да пэўнага моманту фестываль пазіцыянаваўся як адно з цэнтральных ідэалагічных мерапрыемстваў краіны, Саюзнай Дзяржавы і ўсёй СНД. З мастацкага пункта гледжання ён успрымаўся як своеасаблівая справаздача здабыткаў нацыянальнай культуры за год. А ўлічваючы існаванне ў яго рамках Дзён культуры Беларусі, Украіны і Расіі, узнікала і спаборніцтва: чый канцэрт у Амфітэатры будзе лепшым, хто прадставіць больш цікавую выстаўку, стужку... Гэтак апраўдвалася і назва фестывалю, дый атмасфера ў горадзе панавала кірмашовая — з пікнікамі на траве побач з Амфітэатрам, адкуль даносілася музыка.

Пра фармат і неверагодную розніцу на "Славянскім базары-2014"

Сёння ў кагосьці — настальгія па тых, скажам шчыра, п'янках на пленэры, ад якіх пад раніцу цэнтр горада ператвараўся ў вялізны сметнік (ну не навучыліся мы яшчэ, як у Еўропе, адпачываць на газонах культурна). Але ідэя кірмашу знайшла больш адэкватнае ўвасабленне ў вулічным гандлі. Свае палаткі ў час фестывалю разгортвае кожны рэгіён і буйное прадпрыемства. І кошты тут куды ніжэйшыя, бо гандлююць самі вытворцы. Некаторыя расійскія поп-зоркі свае інтэрв'ю пачынаюць так: маўляў, дзякуй за гасціннасць і добрыя, якасныя тавары. Самі ж яны, будучы запрошанымі на фестываль, прапаноўваюць "культурную прадукцыю" далёка не таго гатунку, які мог бы канкурыраваць у свеце.

Таму тое, што "новы фармат" прадугледжвае больш шырокае запрашэнне салістаў і калектываў не толькі з Расіі, можна толькі вітаць. Асабліва калі гэта больш-менш працяглая сольная праграма і "жывы гук", а не адно ўдзел у гала-канцэрце, дзе тэлекампаніі, што вядуць трансляцыю, просяць выступаць пад поўны "плюс" (і нават выстаўляюць гэтае патрабаванне як асноўнае). Сёлета, да прыкладу, такім "жывым камертонам" стаўся англійскі гурт "Blue", які саліраваў цягам аддзялення пасля апошняга дня конкурсу. А калі ў гала-канцэрце закрыцця адразу пасля гэтага цудоўнага квартэта "грымнула" Наталі са сваім "О божа, які мужчына...", неверагодная розніца ў мастацкім узроўні стала відавочнай...

Працяг аналізу сёлетняга форуму чытайце **на старонках 4 — 5.**

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 80-годдзем народнага артыста Беларусі **Генадзя Гарбука**.

Акцэнт тыдня

Намеснік загадчыка мае рацыю

На гэтым тыдні Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у час сустрэчы з уладальнікам буйной гандлёвай сеткі сказаў: "Канешне, я буду падтрымліваць і настойваць, каб прадавалі ўсё ж такі беларускае. Гэтае патрабаванне прасоўваецца мною ў мяккай форме, але мы будзем больш актыўныя ў дадзеным кірунку, і вы павінны разумець, што трэба прадаваць і беларускія тавары".

Сяргей ТРАФІЛАЎ

А за некалькі дзён да гэтага ў сацыяльнай сетцы шараговы пакупнік выклаў адказ ад сеткі гандлёвай з беларускай арніталагічнай назвай, што рэалізуе тавары для дзяцей. Прапанова пакупніка заключалася ў тым, каб пашырыць асартымент друкаваных выданняў і аўдыякніг на беларускай мове. Сярод аргументаў не рабіць таго, на ўзроўні намесніка загадчыка крамы было паведамлена: "Дадзеная група тавара не ўваходзіць у спіс Асартыментнага пераліку, г. зн. крама ажыццяўляе продаж дадзенай групы па ўласнай зацікаўленасці", "...супермаркет не з'яўляецца вузкаспецыялізаваным магазінам па кніжна-друкаванай групе, і наяўнасць кніг і дыскаў на беларускай мове не абавязковая", і, нарэшце, што пры наступным пераглядзе Асартыментнага пераліку прапанова пакупніка будзе ўнесена, "нягледзячы на тое, што цяжкасці могуць узнікнуць з наяўнасцю дадзенага тавара нават у беларускіх выдавецтваў".

Так мяркуе намеснік загадчыка дзіцячага магазіна з беларускай арніталагічнай назвай. Мяркую, з апошнім пунктам нашым выдавецтвам — дзяржаўным і прыватным — і спрачацца смешна. Няхай бы завітала аўтар гэтага адказу на якую Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш ці на Дзень беларускага пісьменства, што пройдзе неўзабаве: хоць з асартыментным пералікам пазнаёміцца. А мо яна і завітала б, каб запрасілі. І тут пытанне да выдаўцоў: а свае дзіцячыя кнігі прапаноўвалі ў дзіцячыя ж крамы? Мо таму і лічаць прадпрымальнікі, што ў выдаўцоў з імі — цяжкасці?..

А вось тэзіс "наяўнасць кніг і дыскаў на беларускай мове не абавязковая" дзівіць, ды ўжо з гледзішча таго, чаму да гэтай пары не ўведзены хаця б пэўныя нормы наяўнасці выданняў на роднай мове для рознічнага гандлю. Крый божа, не 75%, як у свой час у радыёэфіры з беларускай музыкай, але пэўная планка з'явіцца, мяркую, магла б. Чаму? Бо цяпер маем пакаленне бацькоў, якое калі і ідзе па кніжку для дзіцяці, дык не ў кнігарню, а ў бліжэйшы супермаркет. І гэта фактар, які на перспектыву варта аб'ектыўна ўлічваць як кіраўнікам, так і выдаўцам: прынамсі, арыфметычная прагрэсія ліку такіх пакупнікоў непазбежная.

Цяпер маем пакаленне бацькоў, якое **калі і ідзе па кніжку для дзіцяці, дык не ў кнігарню, а ў супермаркет**.

Адсюль і каментарый тэзісу пра тое, што "крама ажыццяўляе продаж дадзенай групы па ўласнай зацікаўленасці". Чытаецца ж паміж радкоў, хутчэй, — "незацікаўленасць". Зразумела, кніжкі, дзе персанажамі — "ліцэнзаваныя" выявы савецкіх ды замежных герояў мультыплікацыі, распрададуць раней, чым самае добрае, але новае выданне з невядомымі героямі на вокладцы. Першай групы ў нашых выдавецтваў, прынамсі, дзяржаўных, няма, а другой — з лішкам...

І вось што атрымліваецца: намеснік загадчыка той крамы мае рацыю па ўсіх трох пунктах. Нешта можна спісаць на неабазнанасць у выдавецкай сферы, на адсутнасць ініцыятывы самой крамы, але якія прэтэнзіі могуць быць, калі "не ўваходзіць", "не з'яўляецца", "не абавязковая" і "цяжкасці могуць узнікнуць"?..

К

Вайсковыя могілкі ля вёскі Каплея Смаргонскага раёна. / Фота да матэрыяла Андрэя МАЦУРА

Добра, калі ў бункеры

Забытыя сведкі **Вялікай вайны**

28 чэрвеня 1914-га — дата ракавога забойства аўстрыйскага эрцгерцага Франца Фердынанта, якое сталася афіцыйнай падставай для пачатку Першай сусветнай вайны. Акурат праз месяц, 28 ліпеня, Аўстра-Венгрыя абвесціць Сербіі вайну, у якую цягам чатырох гадоў будуць уцягнуты больш чым 38 дзяржаў. У выніку яе загіне каля 22 мільёнаў чалавек — салдат і мірных жыхароў. Беларусь сталася адным з тых краёў, што найбольш пацярпеў ад аднаго з самых маштабных канфліктаў чалавецтва.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Лінія фронту, якая пралягла ў часы Вялікай вайны (так яе называлі) па беларускіх тэрыторыях з поўначы на поўдзень, роўная 400 км. Вілейскі, Пастаўскі, Мядзельскі, Баранавіцкі, Смаргонскі раёны... Гэтыя мясціны і да сёння захавалі акопы, доты, бліндажы, бункеры, умацаваныя раёны... Але, на жаль, для многіх тыя помнікі — у ліку незаўважных сведкаў, часткі ландшафту, якая маўчыць пра былое...

Тым не менш, менавіта іх — нябачных і "нетытулаваных" — абраў у якасці аб'ектаў для свайго даследавання фатограф Андрэй Мацур, што родам з вёскі Коўзаны Пастаўскага раёна. Андрэй зацікавіўся тэмай імперыялістычнай вайны дзякуючы слыннаму фатографу Сяргею Качаргіну: маўляў, жывяце ў такіх мясцінах, столькі навокал помнікаў, і не фатаграфуеце, — пажурыў старшы калега.

Андрэй Мацур: "Доты, бліндажы часта захламлены смеццем. Людзі проста не разумеюць, што месца іх адпачынку для кагосьці ў мінулым **сталася месцам смерці**..."

— Тады я і пачаў заглыбляцца ў тэму, — дзеліцца Андрэй, — чытаць літаратуру, наведваць канферэнцыі, пазнаёміўся з гісторыкамі, рэканструктарамі, людзьмі, дасведчанымі ў гэтым пытанні. І паралельна ездзіў ды здымаў памятныя мясціны...

Цягам года і трох месяцаў ён фатаграфаваў у шасці раёнах, дзе праходзіла лінія фронту Першай сусветнай, захоўваючы сціплую паўсядзённасць былых "удзельнікаў баёў". І паступова даследаванне ператварылася ў фотакалекцыю, якая дазваляе паглядзець на памяць пра Першую сусветную як на патэнцыйны і забыты праект. Бо захаваліся яшчэ сведчанні гэтай вайны, здольныя як распавесці пра мінулае, так і задзейнічаць уяўленне. І колькасць сведчанняў — уражвае.

Як жа аўтар знаходзіў аб'екты?

— Дзесьці дапамагалі тутэйшыя, але, напрыклад, па воінскіх пахаваннях неацэнны ўклад у мае пошукі зрабіў гісторык Уладзімір Багданаў. Ён склаў для мяне своеасаблівы маршрут па Смаргоншчыне, — апавядае фатограф.

Даведка "К"

У часы Першай сусветнай вайны, паводле розных даных, ад 700 да 920 тысяч беларусаў былі мабілізаваны ў рускую армію. Амаль паўтара мільёна землякоў зазналі лёс бежанцаў, тры з паловай мільёны трапілі пад акупацыю... Прытым, што насельніцтва Беларусі складала тады каля сямі мільёнаў чалавек...

Таксама адзначае Андрэй і ролю ў адраджэнні памяці пра герояў, ахвяр і падзеі той вайны Барыса Цітовіча, кіраўніка Дабрачыннага культурна-гістарычнага фонду памяці Першай сусветнай "Крокі", мастака і даследчыка. Невыпадкова серыя фатографа ўтрымлівае

фота факт

Дні культуры

Сталічныя Беларуская дзяржаўная філармонія ды Нацыянальны гістарычны музей, а таксама Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску прымаюць мерапрыемствы ў рамках Дзён культуры Туркменістана ў Рэспубліцы Беларусь. Пад час падзеі адбылася сустрэча міністра культуры Беларусі Барыса Святлова з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Туркменістана ў нашай краіне Мурадам Язбердыевым. Сярод дасягнутых дамоўленасцей — правядзенне Дзён культуры Беларусі ў адказ ужо налета. Таксама вырашана ажыццявіць абмен дакументальнымі стужкамі паміж дзяржавамі для паказу праз розныя каналы камунікацыі. Завершацца Дні культуры ўжо заўтра.

На здымку: пад час адкрыцця свята ў сталічнай філармоніі.
Фота Юрыя ІВАНОВА

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

Андрэй Кізіно і шчасце ў тым, што маеш

Жанна ЛАШКЕВІЧ, загадчык літаратурна-драматургічнай часткі Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача:

— На галоўнай старонцы сайта Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача размешчана афіша, што паведамляе: 17 верасня, у першы дзень чарговага тэатральнага сезона, гледачоў чакае сцэнічны жарт на дзве дзеі паводле паэмы "Тарас на Парнасе". А на гэтай афішы ў вобразе галоўнага героя — наш артыст Андрэй Кізіно. 17 ліпеня Андрэя не стала. Ён, артыст, вядучы майстар сцэны, пайшоў ва ўзросце 42-х гадоў — у веку чалавечага і прафесійнага росквіту...

Сыход Андрэя Кізіно — вялікая і горкая страта для Тэатра юнага гледача. Шырокай публіцы гэты таленавіты артыст вядомы па ролях у мастацкіх фільмах "Следчы", "Я тебя боготворю" і тэлевізійных серыялах "Каменская", "Закон", "Неба і зямля", "Снайпер". Маленькія ж гледачы нашага тэатра любілі ягоных усмешлівых Зайцоў ("Нельга нам без сябра", "Парася, якое спявае"), Прынца-філосафа і няўрымслівага прасцяка Жака ("Сястра мая Русалачка" і "Кот у ботах"). Больш сталая аўдыторыя шчыра вітала зайздросніка Петэра ("Петэр Мунк і яго каменнае сэрца"), закаханага Генрыха ("Голы кароль"), нуварыша спадара Журдэна ("Мешчанін у шляхецтве"), хітруна Ігара Мікалаевіча ("Аднакласнікі"), палясоўшчыка Тараса ("Тарас на Парнасе"). Названыя ролі сталі самымі вядомымі тэатральнымі поспехамі артыста.

Тарас — адна з роляў Андрэя Кізіно.

А з 1993 года Андрэй Кізіно абраў яшчэ дзве ролі, якія ў літаральным сэнсе дапамагалі дзецям жыць і змагацца: у Рэспубліканскім дзіцячым анкалагічным цэнтры ён увасабляў вобразы Клоўна Надзеі і Доктара Антошы...

...Калі ўвайсці ў раздзел водгукаў да спектакля "Тарас на Парнасе", дык можна прачытаць такое глядацкае выказванне: "Асабліва мне запомніўся сам Тарас: ён напоўнены нейкай дзіцячай наіўнасцю і любоўю да ўсяго, што яго акружае. Ён проста ставіцца да жыцця, таму шчаслівы тым, што мае. Шкада,

Зацверджаны **новыя апісанні і выявы** эмблемы ды знакаў спецфонду Прэзідэнта краіны па падтрымцы таленавітай моладзі.

здымак слыннага энтузіяста ды выяву Капліцы-помніка святых князёў Барыса і Глеба ў гонар воінаў, загінулых на ратных палях, якая знаходзіцца ў вёсцы Заброддзе.

— Каб не плён гэтых рупліцаў, многае было б згублена, — канстатуе Андрэй Мацур. — Але толькі іх высілкаў недастаткова, бо стан аб'ектаў несуцяшальны…

Доты, бліндажы часта захламлены смеццем, распавядае фатограф. "Людзі проста не разумеюць, што месца іх адпачынку для кагосьці ў мінулым стала месцам смерці. Калі я здымаў у гэтых умацаваннях, ад падобных думак станавілася млосна. Сумна, але гэтыя мясціны існуюць у статусе "дэ факта"…

Асабліва складаная сітуацыя, кажа Андрэй, з пахаваннямі: "На дадзены момант нямецкія могілкі знаходзяцца ў больш дагледжаным стане. Могілкі ж вайскоўцаў рускай арміі часам маюць выгляд масавых пахаванняў, патрабуюць рэканструкцыі. Даводзілася бачыць, калі ў вёсцы Калпея на Смаргоншчыне побач знаходзяцца нямецкія і рускія могілкі. Крыжы з нямецкіх — пакасіліся, ды часам гэта ўсё, што засталося ад магілы воіна. І мясцовыя сабралі тыя крыжы ды склалі ля дрэва, стварыўшы сімвалічнае брацкае пахаванне. Гэтае месца працінае наскрозь…"

Што да стану збудаванняў Першай сусветнай, то некаторым з іх давялося ў сённяшні век атрымаць "другое жыццё". У вёсцы Чухны Смаргонскага раёна Андрэй Мацур знайшоў нямецкі бункер, прыстасаваны… пад лёх.

— У ім бабуля захоўвае бульбу, — распавядае фатограф. — Ён глыбокі, кажа яна, і бульба не мерзне. Гэты выпадак трошкі радуе, бо лёх-бункер хтосьці даглядае…

Некаторым збудаванням Першай сусветнай давялося атрымаць "другое жыццё". У вёсцы Чухны на Смаргоншчыне Андрэй знайшоў бункер, прыстасаваны… пад лёх: "**У ім бабуля захоўвае бульбу.** Ён глыбокі, кажа яна, і бульба не мерзне. Гэты выпадак трошкі радуе, бо лёх-бункер хтосьці даглядае…"

— лёх для бульбы?



Нямецкі бункер, перароблены ў лёх (в. Чухны Смаргонскага раёна).

Разглядаючы здымкі Андрэя, дзівішся таму, як упісваюцца сціплыя помнікі вайны ў паўсядзённы пейзаж. Вось даўгачасовы агнявы пункт — нямецкі дот — бачыцца ўдалечыні поля, засеянага кукурузай. Руіны яшчэ аднаго падобнага збудавання вымалёўваюцца на фоне ветрака ля вёскі Занарач. А вось Серафіма Місюкевіч, жыхарка вёскі Горнае Скорабава, паказвае дот Першай сусветнай вайны, у якім яна хавалася ад артылерыйскага абстрэлу пад час Другой сусветнай…

Акопы, мост па лініі фронту, рэльефныя ўмацаваныя раёны на вышыні… — своеасаблівае цела ландшафту яшчэ захоўвае дзіўныя прыкметы, якія мы часам не хочам заўважаць. Але ўсё змяняецца, калі бачыш гэтыя "шрамы", калі ведаеш, адкуль яны…

Мацур плануе далей працаваць над серыяй, і наперадзе — вандроўкі ў Пінскі раён. Сёлета праект быў падтрыманы Прадстаўніцтвам ЕС у Беларусі, і выстаўку "Нябачныя помнікі Вялікай вайны" можна было ўбачыць у мінскім кінатэатры "Перамога". У верасні яна мае адкрыцца ў Паставах, але, мяркуем, шлях серыі не абмяжуецца дзвюма пляцоўкамі. "Я спрабую сродкамі фота даць слова сваёй зямлі… Безліч разоў я дзякаваў лёсу за тое, што гляджу на свет праз аб'ектыў фотаапарата, а не праз прыцэл", — кажа Андрэй.

К

Фотасюжэт нумара

Нямецкі ўмацаваны раён ля вёскі Расохі на Мядзельшчыне.

Барыс Цітовіч.

Уваход у абаронны аб'ект.

Сцяна бліндажа ля вёскі Чухны на Смаргоншчыне.



Пралом у сцяне дота ля вёскі Пасынкі на Мядзельшчыне.

Рэйкі ля ракі Мядзёлка Пастаўскага раёна.

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

што не ўсе людзі могуць радавацца простым дробязям у жыцці, а гэта ж вельмі важна". А вось фрагмент з водгуку на спектакль "Мешчанін у шляхецтве": "Асабліва мне спадабаўся Андрэй Кізіно. Вы сыгралі проста выдатна! Іншых слоў у мяне няма..."

Работы Андрэя ў тэатры і па-за ім былі прасякнуты любоўю. А чым гэта не нагода, як піша глядач, быць шчаслівым тым, што маеш?..

Пра адраджэнне маёнтка Рушчыцаў

Алесь КВЯТКОЎСКІ, мастак, выкладчык архітэктурнага факультэта БНТУ

— Пасля правядзення традыцыйнага ўжо конкурсу, прысвечанага чарговай гадавіне з дня нараджэння Фердынанда Рушчыца, разам са сваімі студэнтамі з архітэктурнага факультэта БНТУ здзейсніў у сярэдзіне ліпеня творчую вандроўку на радзіму гэтага слыннага мастака.

Жылі мы ў сучасным аграгарадку "Багданаў", а галоўныя замалёўкі рабілі за тры кіламетры шпацыру адтуль — сярод фантастычных краявідаў у самім гістарычным Багданаве, дзе засталіся рэшткі маёнтка Рушчыцаў, гаспадарчыя пабудовы *(здымак з тых мясцін — на старонцы 5 пад рубрыкай "Фотафакт". —* **рэд**.*)*, адрэстаўраваны некалькі разоў касцёл…

Галоўныя пытанні пленэру — як сіламі і талентам будучых архітэктараў паспрыяць хоць частковаму адражэнню маёнтка Рушчыцаў; дапамагчы рэстаўратарам захаваць тое, што маем; як майстарам ландшафтнай архітэктуры "распрацаваць" месцы, адкуль сам Рушчыц маляваў (зразумела тое па ягоных вядомых карцінах) касцёл, млын; цікавыя і яшчэ некалькі кропак, што зараз прываблiваюць турыстаў.

Больш за тое: ёсць прапанова ад тамтэйшага ксяндза Ігара па магчымай перабудове званіцы — можа быць, як у Вішневе ці ў Солах…

І як для будучых архітэктараў для маіх студэнтаў, якія вывучаюць дысцыпліну "Скульптура", ёсць магчымасць распрацаваць ды нават выканаць у матэрыяле бюст ці скульптуру мастака перад яго будучым музеем. Таксама група рабіла замалёўкі каля вёскі Дзясятнікі, дзе маюцца пахаванні салдатаў нямецкай, аўстрыйскай і расійскай армій, палеглых у гады Першай сусветнай вайны.

Работы з пленэру, магчымыя архітэктурныя распрацоўкі тэрыторый вакол сядзібы фаміліі Рушчыцаў, вакол касцёла, вакол самой вёскі будуць дэманстравацца на выстаўцы па выніках IV Рэгіянальнага конкурсу-пленэру "Зямля і неба Фердынанда Рушчыца" з 29 верасня па 12 кастрычніка ў галерэі Мінскай абласной бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна…

26 — 27 верасня ў Гомелі пройдзе II Нацыянальны форум **"Музеі Беларусі"** з конкурсам сярод музейных устаноў.

Дзяжурны па нумары

Калі кормяць — не ноты...

Не толькі пра Шцірліца і Чапаева ходзіць мноства анекдотаў. Маса выдатных баек прысвечана музыкантам. Асабліва мяне замілоўваюць смешныя гісторыйкі пра бас-гітарыстаў. Але вам я распавяду парачку менавіта пра музыкантаў наогул. Вось скажам... Сустракаюцца два колішнія аднакласнікі праз шмат гадоў. Адзін пытаецца: "Ты чым займаешся?" — "Я — музыкант". — "Ну, не хочаш — не кажы..." І варыяцыя з тымі ж героямі: "Ты чым займаешся?" — "Я — піяніст у аркестры". — "Зразумела. А працуеш кім?.."

ТЭКСТ

Алег КЛІМАЎ,
спецыяльны карэспандэнт
газеты "Культура"

Не ведаю, як у іншых шыротах, але ў нашых "палесцінах" гэтыя аповеды нясуць у сабе сэнс глыбокі і актуальны. Бо не сакрэт, што нават тыя выканаўцы, якія служаць у дзяржаўных канцэртных арганізацыях, шукаюць дадатковы заробак. І не заўсёды ён звязаны з артыстычнай дзейнасцю. Што ўжо тады казаць пра тых, хто знаходзіцца ў андэграўндзе: ну не кормяць рокера так, каб "ад пуза" і дзеткам рэгулярна на малачко, выступленні ў клубах ды іншыя сэйшны. Зрэшты, маюць месца і факты, калі выканаўцы, што называецца, заняты на якую чвэрць стаўкі ў той або іншай установе: па факце ж, прыстроена працоўная кніжка.

Карцінка, якой я вас, спадзяюся, заінтрыгаваў, вымалёўваецца стракатая. Напрыклад, рамёствы артыста музычнага і драматычнага, а то і аб'ядноўваючы іх, сумяшчаюць акцёры Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Ганна Хітрык (гурт "S°unduk") і яе муж Сяргей Рудэня (панк-ансамбль "9-ы міліметр"). Працаўладкаваны ў якасці акцёра Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра Ілья Чарапко-Самахвалаў (каманды "Касіяпея" і "Петля пристрастия"). Як дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка вядомы Іван Кірчук ("Троіца"), а як выкладчык на кафедры "Водазабеспячэнне і водаадвядзенне" БНТУ — Іван Вабішчэвіч (Дзядзька Ваня). У Юрыя Несцярэнкі ("White Night Blues" з Бялынічаў) за апошняе дзесяцігоддзе працоўная кніжка пабывала ў музычнай школе, у мінскай краме "Музыка" (кансультант па гітарным абсталяванні), у прыватнай студыі, дзе музыкант навучае ігры, натуральна, на гітары.

А вось як цікава лёс усміхнуўся артыстам, якія выступаюць у адных гуртах. Бас-гітарыст "N.R.M." Юрась Ляўкоў — тэхнік у НДІ Інстытут ядзерных праблем БДУ, а бубнач Алезіс Дземідовіч — дырэктар мастацка-будаўнічай фірмы. Чатырнаццаць гадоў развозіць людзей на таксі бубнач "Нейра дзюбеля" Андрэй Сцепанюк, фронтмен гурта Аляксандр Кулінковіч — пазаштатны аўтар газеты "СБ — Беларусь сёння", а другі вакаліст, Юрый Навумаў, працуе на "Беларусьфільме" на самых розных пасадах: зараз ён — асвятляльнік і спецыяліст па відэакантролі.

Як на Захадзе выплываюць, да прыкладу, рок-н-рольшчыкі з вядомага гурта "Rage", у якім грае выхадзец з Беларусі Віктар Смольскі: **удзельнікі калектыву яшчэ некаторы час таму былі на пасадах ад прадаўца ў краме да настаўніка** гітарнага майстэрства. Не думаю, што з тых часоў у іх жыцці нешта змянілася ў гэтым сэнсе.

Ці такі калейдаскоп. Спявачка Ларыса Грыбалёва валодае "Святочным бюро Ларысы Грыбалёвай". Будзеце паліць камп'ютарныя фашысцкія танкі — згадвайце Уладзіслава Наважылава (Лэслі Найф), вакаліста гомельскага метал-гурта "Gods Tower" ды супрацоўніка беларускага прадстаўніцтва кампаніі-вытворцы гульні. Алесь Таболіч ("Znich") каля сямі гадоў працуе майстрам па перманентным макіяжы і, уласна, тату ў адпаведным салоне. (Паган-фольк-металіст ганарыцца тым, што стварыў, як ён сцвярджае, канцэпцыю нацыянальнай татуіроўкі, а канкрэтна — арнаментальнай). Зміцер Дольнік лічыць грошы, не адыходзячы ад касы: крэатар гурта "The UNB" — банкаўскі служачы…

У дадзенай калонцы мне хацелася б абысціся без залішняга пафасу і не скаціцца да стогнаў: маўляў, гэта што ж такое робіцца, калі таленавітыя людзі не могуць забяспечыць сябе правіянтам у дастатковай меры і "Лексусам" за кошт любімай музыкі?!. Я проста распавёў вам пра некаторых артыстаў, якія не належаць да датацыйных абласцей беларускай культуры, — гэта значыць, тут справа іх асабістая: хочуць яны несці смех, радасць і ўсе астатнія светлыя эмоцыі людзям, выкарыстоўваючы музыку, — хай плывуць і выплываюць самі. Нармальная сітуацыя для краіны з рыначнай эканомікай.

Як на Захадзе выплываюць, да прыкладу, рок-н-рольшчыкі з вядомага гурта "Rage", у якім грае выхадзец з Беларусі Віктар Смольскі: удзельнікі калектыву яшчэ некаторы час таму былі на пасадах ад прадаўца ў краме да настаўніка гітарнага майстэрства. Не думаю, што з тых часоў у іх жыцці нешта змянілася ў гэтым сэнсе. Таму гэта нармальна, калі ў тэкставіка каманды "Без білета" Таццяны Кушнер, якая выдала ў 2009 годзе і сольны альбом, апошні запіс у працоўнай кніжцы — "Перакладчык ва УКБ Мінгарвыканкама" (Таццяна на гэтай пасадзе працавала ў перыяд будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі і Футбольнага манежа). Праўда, цяпер Кушнер усе сілы аддае толькі ансамблю. Як і спявачка Юлія Быкава ("Aura"), што шэсць гадоў адтрубіла лекарам-тэрапеўтам. Як і Раман Жыгараў з магілёўскай каманды "Akute" — яшчэ нядаўна мастак па святле ў прадзюсарскім цэнтры. Сёння ж ён — мастак вольны. Як і...

К

Дыпломы засведчылі: няма не толькі агульнай пляцоўкі — няма з'яднанасці

Вучэбны год скончаны, дыпломы абаронены. Самым нашумелым, бадай, стала пано "Гісторыя горада" ў гатэлі "Мінск", выкананае Надзеяй Чумаковай і Ірынай Юдзянковай з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. А што ж будучыя артысты — драматычнага і опернага тэатраў? Як іх спектаклі?

Надзея БУНЦЭВІЧ

Студэнты зрабілі паказ. Адзіны?

Маладосць + шчырасць = камернасць

Оперная студыя Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ўзялася за самыя, бадай, папулярныя оперныя шэдэўры — сапраўдныя "хіты" гэтага жанру, вядомыя нават далёкім ад музыкі людзям: "Яўгеній Анегін" Чайкоўскага і "Травіята" Вердзі. Ну што можна ў іх яшчэ сказаць — пасля безлічы сусветных зорак ды "крутых" рэжысёрскіх версій?

Скажам адразу: абышлося без авангарда. І загадчык кафедры опернай падрыхтоўкі і харэаграфіі Ірына Гаранец, і вядомы оперны рэжысёр Маргарыта Ізворска-Елізар'ева зыходзілі найперш з музыкі, тонкіх псіхалагічных адценняў, логікі паводзін герояў, іх характараў і, вядома, магчымасцей выканаўцаў. У "...Анегіне" рэзка зрушыліся тэмпы (дырыжоры Алег Лясун, Аляксандр Высоцкі), спектакль у поўным сэнсе слова ажыў, героі неслі шчырасць, кранальнасць першых пачуццяў, недарэчнасць памылак маладосці… Камернасць оперы, закладзеная кампазітарам, яшчэ больш узмацнілася праз купюры: зніклі сялянскія сцэны, скараціўся бальны антураж — усё тое, што было фонам для памкненняў "нявопытнай душы".

Тое ж з "Травіятай" — толькі буйны план і дэталёвасць палітры. А якія галасы! Можа, не было ў іх "сценабітнай" моцы (дый каму яна патрэбна ў такіх празрыстых акварэлевых замалёўках?), але ж колькі з'явілася трапяткіх парываў! А галоўнае, кожным са спектакляў стала рухаць яшчэ і думка — пра лёс маладых людзей, якія, не атрымаўшы ў свой час мудрай парады, дапамогі, расплачваюцца за свае няверныя крокі. Чым не сучасная, надзвычай актуальная праблематыка?

І ўсё б добра, ды толькі ўбачылі тыя адкрыцці далёка не ўсе, хто мог бы. І хацеў. Прытым што залы былі аншлагавымі. Бо першы спектакль прайшоў два разы, другі — тры. І на гэтым — праграма выканана.

Спектаклі "на тры зэдлікі"

У куды горшым становішчы апынуўся тэатральны факультэт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. У час рамонту будынка кіраўніцтва робіць усё магчымае. Спектаклі не перапыніліся, іх рэпеціравалі і паказвалі ў маленькім прыстасаваным пакойчыку. А рэпетуар сёлета аказаўся — ну проста спрэс фестывальны! Большасць п'ес — XX стагоддзя, з сучаснай стылістыкай, новымі драматургічнымі прыёмамі. Чаго варты хаця б "Караль" Мрожака! А тыя ж "Злодзеі" Дэ Лоэр, пастаўленыя кіраўніком курса Зояй Белахвосцік, — увогуле невядомыя не толькі шырокай публіцы, але і знаўцам. У цэнтры ўвагі аказалася і маладая беларуская драматургія — п'еса "А калі заўтра няма?" Дзмітрыя Багаслаўскага. Апошні спектакль, увасоблены мастацкім кіраўніком Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Аляксандрам Гарцуевым, стаўся сумесным праектам Акадэміі мастацтваў і Цэнтра беларускай драматургіі. Вазілі яго і ў Санкт-Пецярбург, на Міжнародны фестываль тэатральных школ "АПАРТ" краін СНД, Балтыі і Ізраіля, дзе ён атрымаў Гран-пры, прычым сярод бо-льш як дваццаці тэатральных ВНУ. Плануецца, што ён стала ўвойдзе і ў рэпертуар самога РТБД.

Але нават за гэты сезон усе творчыя работы курса маглі б сабраць дастатковую колькасць публікі, каб ішлі ў прыстасаваных памяшканнях. Справа не ў тым, што для гэтага ім спатрэбіліся б пышныя дэкарацыі. У тым выглядзе, як яны ішлі зараз, са сцэнаграфіяй "у тры зэдлікі", яны аказаліся самадастатковымі. Пастаноўкі былі зроблены так, што нават думкі не ўзнікала пра неабходнасць багатага ўбрання. Яно толькі адцягнула б увагу ад ігры акцёраў, сачыць за якой было найвышэйшым задавальненнем, і, галоўнае, ад развіцця думкі, якая станавілася ў гэтых спектаклях галоўнай "дзеючай асобай".

На прастор, на шырокі разлог...

Кантрастам да такога становішча — мюзікл "Дуброўскі", пастаўлены расійскай творчай групай на выхаванцаў БДУКіМ (рэцэнзію на яго глядзіце ў № 28 за 2014 г.). Арандавана сцэна нашага Музычнага тэатра, спектакль стаў рэпертуарным. Піяр — найвышэйшы клас (таксама, дарэчы, ажыццёўлены студэнтамі — кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы): безліч прома-прадукцыі, фотарэпартажы з рэпетыцый, працяглы відэаролік, спецвыпуск студэнцкай газеты са шматлікімі інтэрв'ю ўдзельнікаў, не кажучы пра бясплатную праграмку з імёнамі ўсіх, уключаючы аркестрантаў. Але галоўнай дзеючай асобай у гэтым выпадку стаўся сам "прадукт" — расійскі мюзікл.

Калі ў тых жа Акадэміях — музыкі і мастацтва — рэпертуар падбіраецца "пад артыстаў", зыходзячы з іх здольнасцей ды магчымасцей "раскрыцця" на дадзеным матэрыяле, дык на мюзікл праводзіўся кастынг — зыходзячы з тых роляў-партый, што ў ім ёсць. І, галоўнае, у адпаведнасці з прадстаўленнем аўтараў, якім павінен быць той або іншы герой. Калі ў Акадэміях рэпертуар штогод змяняецца, бо прыходзяць новыя студэнты з іншымі творчымі індывідуальнасцямі, дык "Дуброўскі" будзе штогод аднаўляцца за кошт пошуку тых, хто падыхо-

"О божа, які..." самаакупны?

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Але ж менавіта на расійскую папсу хутчэй прадаюцца білеты! Таму і канцэпцыя ўсё больш заключаецца не ў нейкіх там высокіх матэрыях, а ў элементарнай самаакупнасці. Дзеля гэтага нават маніторынг вядзецца: сярод віцябчан праводзяць апытанне, каго яны хацелі б бачыць на фестывалі. У выніку ўвесь "Славянскі базар…" пачынае выклікаць параўнанне з тым натуральным абменам, што ладзіўся паміж еўрапейцамі і абарыгенамі: мы ім — тыя ж ільняныя вырабы, яны нам — нізкапробны, танны "папсень". Дык ці ёсць выйсце з такой сітуацыі?

На Захадзе фестывалі камерцыйнага плана разлічаны найперш на турыстаў, прычым пераважна — замежных. На "Славянскім базары…" у апошнія гады таксама пачаў развівацца культурны турызм — найперш, сярод расіян, якія адпачываюць у нашых санаторыях. Густы ў такой публікі — адпаведныя. Перавыхоўваць іх — дарэмна. Але няўжо ў гэтым і ёсць сэнс ды задачы фестывалю: "прадаваць" расійскім гледачам іхніх жа зорак? У параўнанні з расійскімі расцэнкамі — танней. Нашы ж гледачы, здараецца, год адкладаюць грошы, каб "адзначыцца" на мерапрыемствах. І пакуль публіка гатова выкласці больш за мільён за той жа "фанерны" канцэрт, наўрад ці штосьці зменіцца.

Забаўляць ды навучаць

Імідж, прэстыж "Славянскага базару…" трымаецца пакуль на яго бязмежным, усеахопным разгорце, а не на ўласна мастацкіх якасцях. Калі ж сапраўды дбаць пра мастацкі ўзровень мерапрыемстваў, дык давядзецца ўсё больш увагі надаваць разгалінаванню фестывальнай сеткі — усім тым мерыпрыемствам, якія пакуль застаюцца "па-за кадрам". Даўно відавочна, што калі Амфітэатр усё больш схіляецца да масавай культуры, дык усё самае цікавае на "Славянскім базары…" звычайна адбываецца зусім у іншых кутках Віцебска. Сёлета такімі "промнямі святла" сталіся дзіцячы песенны конкурс, "Макбет" у начным Здраўнёве, праект "Лялечны квартал" і іншыя. Некаторыя новыя цікавыя ідэі з'явіліся ў "Горадзе майстроў". Як бачыце, гэты спіс вельмі адрозніваецца ад тых мерапрыемстваў, якія ўзначальваюць "афіцыйны" хіт-парад. І ад тых, што дэманструюцца мільённым тэлеаўдыторыям (а сёлета "Славянскі базар..." асвятляўся ў тэлеэфіры як ніколі шырока).

У Мінску пачаліся здымкі фільма Аляксандры Бутар **"Салодкае развітанне Веры"** з удзелам беларускіх і літоўскіх акцёраў.

дзіць пад ягоны расклад. Таму не дзіва, што "за бортам" аказаліся некаторыя вельмі адораныя навучэнцы (дадамо, што і статус гэтага спектакля — іншы, не дыпломны). Не трэба тлумачыць, які з варыянтаў здольны прынесці хуткія дывідэнды і, можа, пры некаторых умовах стаць нават самаакупным, на радасць арганізатараў, а які — прынясе плён дзесьці "там, за гарызонтам", але будзе працаваць на будучыню, якой бы пафаснай ні падалася гэтая фраза.

Толькі не трэба катэгарычнага: тое ці гэта. Хай існуюць самыя розныя варыянты далучэння студэнтаў да прафесіі, добрай практыкі і творчай самарэалізацыі ўжо ў час навучання. Але няўжо два згаданыя варыянты нельга неяк сумясціць, каб узяць з кожнага плюсы, пакінуўшы мінусы? Няўжо выйсця няма і, што яшчэ больш горка, не будзе?

Але пляцоўка — гэта толькі знешні фактар, хаця і вельмі важны. Другі бок медаля — **узаемазвязанасць працэсаў,** што адбываюцца ў розных творчых ВНУ, на розных спецыяльнасцях. Нашы маладыя творцы (дый старэйшыя часам таксама) — раз'яднаныя.

Дык дайце, дайце мне пляцоўку!

Выйсце — у тэатральнай пляцоўцы, якая была б пастаянна прадастаўлена для разнастайных студэнцкіх эксперыментаў. Пра гэта гавораць усе і не першы год. Акадэмія музыкі таксама марыць пра асобны будынак опернай студыі, як гэта практыкуецца ў лепшых расійскіх музычных ВНУ. Асабліва востра "сцэнічнае пытанне" паўстала, калі з-за рамонту зачынілася ранейшая сцэна Тэатра-студыі імя Еўсцігнея Міровіча ў Акадэміі мастацтваў. І адначасова на базе той жа навучальнай установы з'явіўся Цэнтр эксперыментальнай рэжысуры, які правёў ужо дзве Лабараторыі рэжысёрскіх праектаў — па адной напрыканцы кожнага семестра. Работы былі паказаны розныя: і толькі распачатыя, і ўжо завершаныя цэласныя спектаклі, і проста чыткі. Усе — з далейшым абмеркаваннем, праўда, выключна лагодным ды пахвальным (для параўнання — у Акадэміі музыкі, дзе студэнты самі выступілі ініцыятарамі паказаў новых кампазітарскіх работ, абмеркаванні звычайна куды больш прыдзірліва-крытычныя). Ды як пра штосьці казаць, калі большасць паказаў — у школьным класе, дзе публіка — за партамі? Нават праект завочніцы 4-га курса Наталлі Ляванавай — спектакль "Па імені Gospodin" па п'есе сучаснага нямецкага драматурга Ф.Лёле, адабраны для ўдзелу ў праграме Міжнароднага форуму тэатральнага мастацтва "ТэАрт-2014", збіраюцца паказваць там жа, дзе ён прайшоў зараз: на Малой сцэне РТБД, якая ўяўляе з сябе усяго пакойчык у закуліссі…

Як вас завуць? А тэлефончык можна?

Але пляцоўка — гэта толькі знешні фактар, хаця і вельмі важны. Другі бок медаля — узаемазвязанасць працэсаў, што адбываюцца ў розных творчых ВНУ, на розных спецыяльнасцях. Нашы маладыя творцы (дый старэйшыя часам таксама) — раз'яднаныя. Тым жа кампазітарам ды рэжысёрам, хочуць яны таго ці не, даводзіцца самастойна вырашаць праблемы з выканаўцамі, каб ім і грошы не плаціць, і зрабіць з іх апантаных аднадумцаў. А ці не патрабуюць тыя ж тэатральныя пастаноўкі працы кампазітара, менеджара, іншых "калятэатральных" спецыялістаў?

Так, усіх іх не рыхтуюць у адной ВНУ (хаця ў замежжы і ёсць кансерваторыі-акадэміі-інстытуты з аддзяленнямі музыкі і тэатра). Але гэта не той варыянт, дзе трэба дзяліць на "ваша-наша", — культура ў нас агульная. І кола яе творцаў даволі вузкае. Дык ці не пашырыць яго хаця б за кошт унутраных сувязей? Прытым што кожная з навучальных устаноў імкнецца развіваць знешнія стасункі (і правільна робіць!), чаму б не задзейнічаць і суседскія — што называецца, праз вуліцу?

У такім супрацоўніцтве нараджаліся б не толькі цікавыя творчыя праекты, але і будучыя ўстойлівыя тандэмы (тая ж трыяда "рэжысёр — кампазітар — мастак"), без якіх цяжка ўявіць не проста асобныя здабыткі, а з'яўленне заўважных прагрэсіўных тэндэнцый, асабліва ў сінтэтычных жанрах, дзе ўсе складнікі ўзаемазвязаны. Дадайце сюды мадэльераў, якія пры неабходнасці фантазіравалі б над касцюмамі, працу вучэбна-вытворчых камбінатаў, дзе можна было б пашыць некаторыя строі. А "раскрутка"? Калі ў студэнтаў БДУКіМ так здорава атрымалася прасоўванне "Дуброўскага", дык чаму б ім гэтак жа не ўзяцца і за піяр нацыянальнага мастацтва, эксперыментальных пастановак? Пры гэтым узняўся б узровень і творцаў, і "рэкламшчыкаў", актывізаваліся б маладыя крытыкі, якіх пакуль днём з агнём трэба шукаць.

Яшчэ адным вынікам такога супрацоўніцтва магло б стаць... элементарнае пашырэнне кола "спажыўцоў" разнастайных мастацкіх "прадуктаў". Вы бачылі, да прыкладу, музыкантаў у драмтэатры? Ці акцёраў — у зале філармоніі? Вядома, бачылі — як выключэнне. Ці калі сябры паклічуць. Дык няхай тых сяброў будзе больш! Тады, пэўна, і "сярэднестатыстычны глядач-слухач" стане іншым: больш дасведчаным, здольным ацаніць не толькі забаўляльнае відовішча, але і элегантны росчырк думак…

К

ф о т а ф а к т

Багданава Рушчыца

На старонцы 2 у рэпліцы мастака Алеся Квяткоўскага вы можаце даведацца, якія перспектывы ў руін фамільнага маёнтка знакамітага мастака Фердынанда Рушчыца. Ці прапануюць маладыя архітэктары варыянты для будучага адраджэння пабудоў маёнтка? / **Фота Алеся КВЯТКОЎСКАГА**

Летні фестываль мае свае асаблівасці. Спякота, адпачынкавы настрой патрабуюць чагосьці больш лёгкага, чым восеньскае філасофстваванне ці вясенні ўсплёск энергіі. Але ў тым, як можна без праблем сумясціць прыемнае з карысным, забаўлянку з асветніцтвам, смех з роздумам і да т.п., пераконваў, напрыклад, "Лялечны квартал". Гэты праект змяшчаў такія "гасцявыя" спектаклі, як нашумелая "Пікавая дама" гродзенцаў у пастаноўцы Алега Жугжды і дзве пецярбургскія пастаноўкі — "Вершнік Cuprum", якога мінчане бачылі летась на Міжнародным фестывалі лялечных тэатраў, і "Русалка Света з вёскі Перамілава", напалову пабудаваная на інтэрактыве. У кожным — мора пазітыўных эмоцый, здаровага смеху, якія выклікаюць у гледача дадатковае жаданне "ўключыцца" ў творчы працэс, прапанаваны артыстамі.

А вось кінапраграма, якая патрабуе не так шмат грошай, сёлета, здаецца, канчаткова сябе зжыла. Можна скардзіцца на тое, што глядач абыходзіць яе ўвагай, а можна пашукаць новыя формы падачы. Ці хаця б скарэктаваць тое, якія менавіта стужкі будуць дэманстравацца. Бо наша кінастудыя, напрыклад, была прадстаўлена фільмам "Бабу" — сумесным і, прызнацца, сумніўным па мастацкіх вартасцях. Можа, у такіх выпадках лепш нічога не паказваць?

Калі ж паказваць, дык яшчэ і з адпаведнай рэкламай, анонсамі. Той жа тэатр "Лялечны фармат" з Санкт-Пецярбурга сабраў на свой першы спектакль залу паўнюткую, але без аншлагу. А на другі, калі спрацавала "сарафаннае радыё", ад публікі адбою не было!

Сёння, дарэчы, у культуры склалася сітуацыя, калі "прадаць" можна — усё. У тым сэнсе, што на любы "прадукт" можна знайсці ўдзячнага пакупніка. Толькі шукаць трэба сярод пэўнай аўдыторыі, не спасылаючыся на тое, што афішы, маўляў, былі, ды народ чытаць "не ўмее". Але акрамя ўласна "продажу", кожная мастацкая з'ява патрабуе і свайго прасторавага атачэння: тое, што цудоўна ўспрымаецца "на адлегласці рукі", нельга пераносіць на стадыён, і наадварот. Гэтак жа — з паказамі "на пленэры". Нашы дзеячы яшчэ толькі асвойваюць усе гэтыя прамудрасці, таму так важна падтрымліваць кожную перспектыўную прапанову і ўдалую спробу. Тым больш, калі тыя — крэатыўныя.

Так што, калі "Славянскі базар у Віцебску" даўно ўжо называюць "фестывалем фестываляў", дык няхай гэты ганаровы статус рэалізуецца напоўніцу — у прамым сэнсе слова. Форум, які яднае розныя віды мастацтваў, а не адно эстрадныя спевы, можа — і павінен! — утрымліваць у сабе не проста асобныя праекты "на розныя густы", уключаючы высокі, а некалькі міні-фестываляў — эксклюзіўных, аднолькава цікавых як для шырокай публікі, так і для спецыялістаў. Бо апошняе — паказчык таго, што такі фестывальны рух будзе рухаць і нацыянальную культуру.

К

На маю думку…

Сітуацыю аналізуем

Чым былі адметныя сёлетнія дыпломы ў Акадэміі мастацтваў? Кардынальных адрозненняў у параўнанні з мінулым годам можна было і не заўважыць, але ў параўнанні з узроўнем дзесяці- або пяцігадовай даўніны яны відавочныя. Значна больш стала работ, якія сёння можна атаясамліваць з такой з'явай, як сучаснае мастацтва. Гэтая тэндэнцыя назіраецца ўжо не першы год. Акадэмічная традыцыя ў работах дыпломнікаў прысутнічае, але відавочная яе трансфармацыя. Гэта датычыцца ўсіх чатырох факультэтаў Акадэміі.

Т Э К С Т

Міхаіл БАРАЗНА,
рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар

На факультэце экранных мастацтваў летась была цікавая абарона анімацыйных фільмаў. Тое ж тычыцца і рэжысёраў кіно. Таму трэба параўноўваць не з мінулым годам, а з больш даўнімі абаронамі. На прыкладзе аніматараў можна казаць пра інтэграцыю ў свет сучаснага мастацтва, у еўрапейскія тэндэнцыі. Дарэчы, гэтыя ж працэсы адбываюцца і ў нашых суседзяў, у прыватнасці — у Расіі. Там таксама ёсць праявы сінтэзу акадэмічнай якасці і канцэптуальнага, паводле сённяшняга разумення, погляду на жыццё.

Запомніліся абароны на графічным, прамысловым дызайне. Дызайнеры-графікі працуюць не для музеяў ці аздобы багемнага жыцця — іх творы прызначаны для рэальнага асяроддзя, прасторавай сітуацыі. Тыя плакаты, кніжная паліграфія з'яўляюцца часткай мастацкага інтэрактыўнага працэсу. Па дызайне транспартных сродкаў была прадстаўлена шырокая панарама — ад мадэлей, прызначаных для шырокага кола спажыўцоў, да рэчаў эксклюзіўных. У тым ліку і пілотныя праекты, напрыклад, макет аўтамабіля 2025 года, зроблены дыпломнікам у буйным нямецкім канцэрне.

Тэатральнае мастацтва таксама прадэманстравала, як мне падаецца, яркую тэндэнцыю. І, разам з тым, я рады, што выпуск заслужанай артысткі краіны Зоі Белахвосцік засведчыў прагу не толькі да кінетычных форм, пластычнага руху, відовішчнасці ў фармаце шоу, але і да тых традыцый сцэны, дзе псіхалагічны вобраз з'яўляецца асноўнай часткай працэсу. Хачу нагадаць, што гэты выпускны курс з месяц таму атрымаў у Санкт-Пецярбургу Гран-пры на Міжнародным фестывалі студэнцкіх тэатраў краін СНД, і не толькі. Абараняўся курс спектаклем, які быў паказаны на тым фэсце.

Мастацкі факультэт у нас, відаць, самы панарамны, складаны. Тут абарона запомнілася найперш тым, што мы ажыццявілі першы ў гісторыі мастацкай адукацыі Беларусі выпуск мастакоў-рэстаўратараў. Іх прызначэнне — праца з нерухомымі і рухомымі помнікамі. Гэта датычыцца фрэскавага, станковага жывапісу, графікі, іканапісу. Выпуск — даволі роўны і адпавядае ўсім стандартам рэстаўрацыйнай справы. Спадзяюся, яго веды будуць запатрабаваны не толькі ў практычнай, але і ў навуковай галіне. Уласна кажучы, рэстаўрацыйная школа ў нас ёсць, як і спецыялісты высокай кваліфікацыі, а вось навуковых даследаў бракуе, як і практыкі перадачы досведу праз навучальны працэс у акадэмічным асяродку. Думаю, выпускнікі бягучага года запачаткуюць такую практыку. Я ўпэўнены, што сёлетні выпуск рэстаўратараў у Акадэміі — такая значная падзея для культуры Беларусі, як калісьці, у 1953-м, першы набор графікаў, жывапісцаў, скульптараў…

Манументальны роспіс таксама прадэманстраваў цікавыя праекты. Гэта найперш работа, створаная выпускніцамі ў гатэлі "Мінск". Вельмі добра, што яны паспелі зрабіць дыплом на месяц-паўтара ранейза тэрмін: да адкрыцця Чэмпіянату свету па хакеі работа была гатова.

Графіка традыцыйна прадэманстравала высокую тэхналагічную якасць. Але, здаецца, самае важнае, што работы кафедры графікі не зблытаеш. У іх — экспрэсія і моц, праз якую ёміста адлюстраваны дух часу (прагучыць пафасна, але яно насмрэч так). Ну і дадам, што ў рамках "Славянскага базару ў Віцебску" праходзіў фінал "Арт-Сесіі", дзе, упершыню ў гісторыі гэтай акцыі, былі прадстаўлены дыпломныя работы вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў Беларусі ды іншых краін. Нашы графікі — сёлетнія выпускнікі — атрымалі дыпломы лаўрэатаў, прычым галасаванне было аднагалосным.

Нельга абмінуць пэўнае крызіснае становішча ў жывапісе, але тычыцца гэта не толькі і не столькі самой Акадэміі. На "Арт-Сесіі" ў намінацыі "Жывапіс" не было прысуджана звання лаўрэата ніводнаму ўдзельніку. І падобны стан з'яўляецца тыповы рысай для мастацтва ў Беларусі і замежжы.

Мы сітуацыю аналізуем і прадугледжваем у навучальным працэсе пэўныя крокі для таго, каб дадаць дынамізму падрыхтоўцы жывапісцаў. Тэрмін "выхаванне" невыпадковы, бо светапоглядныя чыннікі — бадай, вызначальныя. Студэнт Акадэміі мусіць атрымаць прафесійныя веды і развіць пэўныя рысы характару. Цягам шасці гадоў імкнёмся навучыць самастойнасці, падрыхтаваць да жыцця і працы ў варунках інфармацыйнага грамадства.

Мы акрэслілі захады для таго, каб на кафедру жывапісу прыходзіла пакаленне маладых. Ізноў падкрэслю, што гэта не столькі праблема кафедры жывапісу, колькі праява стаўлення да апошняга. У культуры, у грамадстве наогул узрастае цікавасць да манументальных форм, інфаграфікі, фотаграфікі, дызайну. Станковы жывапіс і, у пэўным сэнсе, станковае мастацтва апынуліся на перыферыі. Ім цяжэй знайсці сваё месца ў сучаснай архітэктуры, прыстасавацца да новай эстэтыкі. А вядома, што архітэктура заўжды вызначала тып і від жывапісу. І сёння архітэктарам ды мастакам трэба разам шукаць паразуменне, дбаць пра сінтэз, абмяркоўваць перспектывы. Мастакі-станкавісты, на маю думку, павінны зыходна арыентавацца не на папаўненне сваімі творамі музейных фондаў і не на спарадычнае з'яўленне карцін, скульптур, графічных аркушаў у выставачных залах, а на сталае існаванне работ у публічнай прасторы. Мяркую, што і грамадства мусіць зрабіць захады для рэалізацыі сацыяльнай функцыі творцаў.

Хачу сказаць, што ў Акадэміі, нягледзячы на не ідэальныя ўмовы для навучальнага працэсу (ідзе капітальны рамонт галоўнага будынка, і ўсім кафедрам ды адміністрацыі давялося моцна "ўшчыльніцца"), традыцыя не згублена, праграмныя патрабаванні не зніжаны ды якасць адукацыі не пагоршылася. Упэўнены ў тым, што мерапрыемствы юбілейнага, 70-га, года — выстаўкі, выданні альбомаў, каталогаў — падцвердзяць: Акадэмія з'яўляецца не проста навучальнай установай, але і сапраўдным цэнтрам сучаснага мастацтва. У юбілейны год плануем зладзіць пазітыўную, без лакіроўкі, палеміку па шырокім спектры праблем мастацтва, абмеркаваць сённяшні стан і перспектывы творчай сферы, для якой рыхтуем кадры…

Спектакль паводле твора Андрэя Саўчанкі "Бі-Лінгвы" трапіў у беларускую праграму **Міжнароднага форуму "ТэАрт"**.

Калі ўключыць арыфметыку...

Дзе ідуць тэатральныя "пастары"?



Сцяпан Лаўшук. / Фота Юрыя ІВАНОВА

Літаратуразнаўца і крытык, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сцяпан ЛАЎШУК, які 28 ліпеня адзначае 70-годдзе, шмат увагі прысвяціў беларускай драматургіі і тэатру: яго пяру належаць звыш трохсот публікацый. Сцяпан Сцяпанавіч выпусціў шмат маладых аспірантаў-навукоўцаў, дысертацыйныя даследаванні большасці з якіх былі прысвечаны праблемам развіцця нацыянальных драматургіі і тэатра.

— Як мастацтва ўвогуле і тэатр у прыватнасці могуць служыць чалавеку ў XXI стагоддзі?

— Служыць — гэта значыць дапамагаць. Як бы мы ні рабілі папраўкі на новы час і новыя пакаленні, місія мастацтва — гэта, перш за ўсё, усталяванне ў сучасным соцыуме тых асноў, якія робяць чалавека homo sapiens. Мы хвалімся тым, што ў нас поспехі ў тэхніцы, у навуцы ды іншых галінах, а чалавек жа застаецца, у прынцыпе, тым жа, якім быў многія стагоддзі таму. Пераконваюся ў тым пры знаёмстве з новымі перакладамі твораў антычных аўтараў. Але перад тымі выклікамі, якія час прапаноўвае новаму пакаленню, кожнае заяўляе, што яно — новае, інакш мысліць і прыстасоўваецца да праблем рэчаіснасці. У пэўным сэнсе гэта так. Але ж і не дарэмна нарадзілася выслоўе: "У адну і тую ж раку нельга ўвайсці двойчы".

Калі ў нашым мастацтве з'явяцца значныя фігуры, якія спалучалі б у сабе вялікі эстэтыка-творчы патэнцыял з грамадзянска-патрыятычнымі пазіцыямі і зацікаўленасцямі, то не спатрэбяцца заклікі, пастановы. І мастацтва будзе натуральна прапаноўваць тыя рэчы, якія стануць даваць гледачу эстэтычнае задавальненне, нароўні з філасофскімі ды этычнымі праблемамі. Я ніколі не баюся прызнавацца, што спавядаю традыцыяналісцкія погляды. І ніколі не забываўся, што калі тэатр перастае быць кафедрай, з якой можна сказаць свету шмат добрага, то трэба думаць, які шлях у гэтага тэатра будзе надалей. Нам бы сёння неяк агледзецца, таму што зацягнулася пара эксперыментаў: я не супраць іх, але трэба, каб вынікі меліся. Будзе яшчэ не адна падобная хваля, і яны, у рэшце рэшт, могуць нешта падказаць, але трэба аналізаваць, куды мы імкнёмся…

— Вы сцвярджаеце, што глабальна функцыя мастацтва не змянілася, але час ідзе, і змяняюцца сродкі выразнасці. Як сцвярджаў чэхаўскі Трэплеў, "новыя формы патрэбны". На ваш погляд, тэатр павінен быць сучасным па тэмах ды сродках выразнасці? І які беларускі тэатр?

— Калі я скажу, што ён такім не з'яўляецца, то тэатральныя дзеячы са мной не пагодзяцца. Але галоўным застаецца пытанне: што такое сучасны тэатр і — сучасныя сродкі выразнасці? Калі мы адрынем традыцыяналісцкі падыход, дык гэта яшчэ не значыць, што адразу займеем сучасны тэатр. Сучаснае, у маім разуменні, — гэта тое, што з часам увойдзе ў традыцыю. Але трэба, каб яно проста існавала — рэальна. Некаторыя мае калегі кажуць так: раз гэта створана сёння, значыць, тое і ёсць сучасны падыход. І не важна, які ён. Ніякіх берагоў. Бо і сапраўды, адзнак, напрыклад, жанравых, сучаснасць не мае.

— Ці з'яўляецца рэпертуарны тэатр па-ранейшаму найлепшай мадэллю тэатра? Мо наспела неабходнасць яго трансфармаваць ці наогул адмовіцца на карысць тэатра праектнага?

— Ад рэпертуарнай палітыкі адмаўляцца нельга. Іншая справа — хто яе вызначае. Апошнім часам мне вельмі "падабаецца" маскоўская тэатральная практыка: калі ёсць у цябе грошы, ты, згодна са сваімі меркаваннямі, робіш тэатр. Але вернемся да нашых краёў. У нас складваецца нейкая дзіўная рэпертуарная палітыка, бо нехта баіцца, каб чаго не выйшла, нехта проста не разумее, як тэатральную справу можна выкіраваць, нехта ўвогуле абыякава ставіцца… І дарэмна. Бо ў многіх краінах менавіта тэатр з'яўляўся народабудаўнічым фактарам. Францыя, напрыклад, свой тэатр беражэ як зрэнку вока, бо менавіта ён з'яўляецца адным са складнікаў нацыянальнай светабудовы. Так і ў нас павінна быць. Пагадзіўшыся з высновай, што кадры вырашаюць усё, нам трэба кінуць усе сілы на падрыхтоўку кадраў для тэатраў. І найперш — рэжысёраў. У нас, канешне ж, на сённяшні дзень далёка не пустыня, але Уладзіслава Галубка няма, Фларыяна Ждановіча таксама. Не відаць ні Еўсцігнея Міровіча, ні Канстанціна Саннікава… Гэтыя творцы ведалі, што лёс усклаў на іх вялікія абавязкі. Яны заўсёды пачувалі сябе абраннікамі, гэта значыць — служкамі сваёй Айчыны. Яны стараліся не аглядвацца на тое, як іхняя дзейнасць будзе ацэнена ўладамі, не дужа асцерагаліся, што ўзнімецца вэрхал у СМІ з-за нейкіх адступленняў ад агульнай лініі. Яны проста працавалі — адказна, творча, з поглядам у заўтра…

— Вы прыгадалі еўрапейскі тэатр. У ім цяпер існуе тэндэнцыя: рэжысёр імкнецца зачапіць гледача, адчувальнасць якога прытуплена, імкнецца шакаваць публіку. Перабіраю ў памяці спектаклі ў Польшчы, і з цяжкасцю магу ўспомніць, у якім з іх няма поўнасцю аголеных акцёраў… Наш тэатр таксама з часам пойдзе такім шляхам?

— І ў нашым тэатры ўжо такое ёсць. А Польшча? Я глядзеў запісы некалькіх тамтэйшых выбітных, як мне казалі, спектакляў. Магу сказаць: вядома, ёсць у іх знакамітыя і акцёры, і рэжысёры, але для мяне важны рэпертуар. Палякі, здаецца, крыху самазаспакоіліся ў гэтым плане, лічаць сябе самадастатковымі ва ўсіх сэнсах. Але многае з таго, што яны прапаноўваюць, ужо было, напрыклад, у Італіі…

— Сучасны глядач хоча меладрам і камедый. Што рабіць тэатру? Пагаджацца на гэта?

— У свой час у Мінск з задавальненнем прыязджалі на гастролі самыя знакамітыя тэатральныя калектывы. І не толькі з суседніх рэгіёнаў: Расіі, Украіны, Прыбалтыкі і г. д. Ахвотна ехалі сюды таму, што Мінск меў славу горада тэатральнага, з глядацкай аўдыторыяй не толькі масавай, а надзвычай падрыхтаванай, здольнай чуйна і адэкватна ўспрымаць самыя тонкія нюансы сцэнічнага мастацтва, рэжысёрскага і акцёрскага майстэрства. А сёння? Няўмелая рэпертуарная палітыка, нярэдкае скочванне пры спробе пашырэння тэматычных гарызонтаў да чарнухі распудзілі мінскіх прыхільнікаў Мельпамены. Зрэшты, сёння таксама існуе пастаянны кантынгент гледачоў, які не прапускае ніводнай прэм'еры, наведвае спектаклі брэндавых гастралёраў, але ён вельмі нешматлікі. У асноўным жа глядзельную залу запаўняе глядач выпадковы, з зацікаўленасцю пралётнай птушкі: сёння ён ёсць, а заўтра — і следу не засталося…

Вы кажаце, што сённяшняму гледачу даспадобы камедыя і меладрама? Я не бачу ў такой арыентаванасці ніякага негатыўнага падтэксту. Тая ж камедыя адвечна — ад Арыстоцеля да Макаёнка — нязменна была запатрабаванай у тэатрах. З меладрамай складаней. У XIX стагоддзі за ёй трывала замацавалася ўяўленне як пра жанр мяшчанскі, слязліва-экзальтаваны і нават пошлы. А між тым, такія выдатныя знаўцы тэатральнай справы, як Анатоль Луначарскі і Максім Горкі, на пачатку XX стагоддзя менавіта меладраму прапаноўвалі пакласці ў аснову рэпертуару новага рэвалюцыйнага тэатра, ачысціўшы яе ад антымастацкіх шлакаў. І яны не памыліліся: на зломе эпох меладрама напоўніцу выявіла сваю эстэтычна-мастацкую і грамадска-палітычную запатрабаванасць. Сёння мы таксама жывём на зломе эпох. Так што…

Што ж да гледача, дык, падладжваючыся пад яго густы, мы, хутчэй, губляем яго. Няма такога тэатра, які не хацеў бы падабацца гледачу. Але якой цаной — вось што важна. Памятаю, зайшоў я па нейкай справе ў Купалаўскі тэатр (яшчэ ў старым будынку). У цесным вестыбюльчыку чорнага ўваходу сутыкнуўся з адным з народных артыстаў. Тут жа, як самнамбула, сноўдалася маладая актрыса, вышэптваючы словы сваёй ролі. Народны на адрас сваёй каляжанкі па нейкай прычыне сказаў некалькі салёных, не вельмі інтэлігентных слоў. Хутчэй ад нечаканасці, а не таму, што мне спадабалася, я зарагатаў. І ён пачаў (яна ж цалкам у вобразе, таму нічога не чуе) сыпаць падобнымі фразамі: давай рагачы! Потым яму нешта дайшло, і я пачуў: "Даруй… Перабор…" Гэтую сітуацыю можна экстрапаліраваць на ўвесь тэатр. Праўда, прабачэння ў гледача — за перабор — ніхто ніколі не прасіў. А імкненне падабацца — гэта абсалютна нармальна, але, паўтаруся, усё павінна вымярацца пастулатамі мастацкасці. Без гэтага, я не разумею, навошта патрэбна дзяржаве выдаткоўваць сродкі на тэатр, а гледачам — марнаваць свой час…

— Вяртаючыся да драматургіі, пра якую вы шмат пісалі: якое месца, на вашу думку, беларуская драматургія займае ў айчынным тэатры?

— Калі ўключыць арыфметыку, то — вельмі нязначнае. Але некаторыя мае знаёмыя кажуць, што існуе яшчэ і "вышэйшая матэматыка": нібыта пры фарміраванні рэпертуару рэжысёры на падсвядомым узроўні арыентуюцца на здабыткі нацыянальнай драматургіі. У гэтай сувязі згадваецца Алесь Петрашкевіч. Ён быў, бадай, самым пасіянарным ды паслядоўным абаронцам годнасці і правоў гэтай драматургіі, рэзка крытыкаваў прыхільнікаў такой "вышэйшай матэматыкі", выкрываў праявы абструкцыянісцкага стаўлення да твораў беларускіх аўтараў. І меў, вядома ж, рацыю. Слушнасць яго прэтэнзій добра ілюструецца сцэнічным лёсам ягоных п'ес. Ставілі яго нашы тэатры даволі шырока. А сёння цікавасць з боку рэжысёраў адсутнічае. І гэта прытым, што ягонаму пяру, апроч іншага, належыць салідны цыкл гістарычных драм, у якіх асэнсоўваецца гістарычны шлях Беларусі, пачынаючы з X стагоддзя.

Пазіцыю Петрашкевіча аспрэчыць было вельмі цяжка, бо і сапраўды ўсе агульнапрызнаныя поспехі беларускага тэатра звязаны менавіта з пастаноўкамі твораў айчыннай драматургіі. Узгадаем некаторыя факты з гісторыі. Міхась Чарот напісаў у 1921 годзе п'есу "На Купалле", і калі павезлі спектакль у Маскву, дык там быў сапраўдны фурор! Тамтэйшыя крытыкі напісалі добрыя рэцэнзіі, прыязныя водгукі зрабілі замежныя рэцэнзенты, у тым ліку і французскія спецыялісты. Далей Кандрат Крапіва з п'есай "Хто смяецца апошнім" — ізноў фурор у Маскве! Потым — эпоха Андрэя Макаёнка: усе тэатры яго ставілі! Ва Усесаюзнае тэатральнае аб'яднанне з усяго савецкага рэгіёна ішлі заяўкі: "Дайце беларускую п'есу!". Яна стала брэндам. Нават аўтара не пыталі. Гэта зафіксавана. Бо апроч мастацкай якасці беларуская п'еса вызначалася і вастрынёй грамадзянскіх праблем. Паколькі такі факт быў, ён можа паўтарыцца.

— Якраз маладая айчынная драматургія аказалася зараз вельмі запатрабаванай за межамі нашай краіны. І тут мае месца дзіўны факт. Дзмітрый Багаслаўскі спачатку ставіцца ў Тэатры Маякоўскага ў Маскве, і толькі потым — у Тэатры беларускай драматургіі (зараз жа чакаецца прэм'ера ў Купалаўскім). Павел Пражко: спачатку хваля пастановак па яго п'есах — у Маскве, і толькі потым — у нас. З Аляксеем Дударавым у свой час была тая ж самая гісторыя. Чаму мы самі не адкрываем сваіх аўтараў?

— Я згодзен і магу пашырыць інфармацыю. Макаёнак мог у любы час зайсці да першага сакратара ЦК КПБ Пятра Машэрава, але нават яго спачатку ставілі ў Маскве. Справа ў тым, што рызыкаваць ці не, вызначалася і вызначаецца ў тэатрах. Традыцыя — магутная. Яе не так проста зламіць. Трэба, каб змянілася, прынамсі, два пакаленні "насельнікаў" тэатральнага і калятэатральнага свету. І тады будзе новае стаўленне, і мы забудзем аб практыцы, калі беларуская п'еса, каб трапіць на нацыянальную сцэну, павінна прайсці апрабацыю за мяжой. А нашы тэатры стануць сапраўднымі храмамі высокай духоўнасці, дзе і ўзаемаадносіны будуць храмавымі: "пастар" будзе крочыць наперадзе "паствы", а не панура плесціся следам за ёю…

фотафакт

Латвія як хор

Арт-праект сучасных латвійскіх мастакоў і, у прыватнасці, мясцовай Акадэміі мастацтваў "Самы вялікі хор у свеце" прадстаўляе вобраз Нацыянальнага свята песні і танца гэтай краіны. Палатно шырынёй 22 метры складаецца 12 узаемазвязаных карцін. Праект з таксама прадстаўляе Рыгу як Культурную сталіцу Еўропы-2014.

ТЭКСТ

Крысціна СМОЛЬСКАЯ,
кіраўнік літаратурна-драматычнай часткі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, тэатральны крытык

Ва Ушачах імем **народнага паэта Рыгора Барадуліна** назавуць вуліцу, а Музей народнай славы пашырыць экспазіцыю пра творцу.

А.М., М.М. ды іншыя

Хто не ведае мастака Кашкурэвіча і хто ведае лінгвіста Янкоўскага?

Не так даўно папрасілі мяне зірнуць у якасці рэдактара тэксты да альбома, які аб'яднаў пад адной вокладкай рэпрадукцыі твораў выяўленчага мастацтва з фондаў айчынных музеяў. Пачаў я знаёміцца з тым тэкстам не з ягонага лагічнага пачатку, а з раздзела, прысвечанага беларускім творцам. І вось тут мяне чарговы раз прымусіла задумацца адно пытанне, што, прызнацца, набіла ўжо аскому.

Сяргей ТРАФІЛАЎ

Сэканомілі альбо…

Вось скажыце, ці вядомыя вам, шаноўныя чытачы, такія беларускія мастакі, як Кішчанка і Кашкурэвіч (пішу наўмысна без імёнаў)? "Несумненна!" — урэшце, так і мусяць адказаць чытачы "Культуры". Адзін — майстар жывапісу, габелена, манументальнага мастацтва, другі — сусветнага ўзроўню графік. Дык вось, у згаданым альбоме будзе прадстаўлена па рабоце кожнага. І подпісы перад назвамі твораў: "А.М. Кішчанка" і "А.М. Кашкурэвіч". І ў тэксце ўступных артыкулаў гэтак жа. Такім чынам, на ўвесь альбом — ніводнага выпадку поўнага напісання імён гэтых творцаў. Зрэшты, як і ўсіх астатніх там прадстаўленых, вядома, выключна з ліку дзеячаў беларускага мастацтва. А вось асобы з сусветнага мастацкага Алімпа ці маючыя дачыненне да рускай культуры — пададзены з поўным напісаннем у адпаведных раздзелах.

Як гэта патлумачыць? Эканоміяй, нібыта на прыназоўніках у тэлеграме? Спадзяюся, апошняе не так, бо было б гэта ўжо надзвычай цынічна. Але ж, з іншага боку, колькі ўжо такіх альбомаў з падобнымі "ініцыялізаванымі" творцамі мелі месца? Ды не злічыць! А мо аўтар тэксту беларускага раздзела аказаўся проста… абыякавым да таго, што пісаў? Чамусьці, не адзін год назіраючы за станам спраў у нашай культуры і, зноў жа, абыякавым, скажам шчыра, стаўленнем да яе з боку некаторых адказных і не вельмі работнікаў названай сферы (далібог, далёка не ўсіх!), у апошняе мне верыцца з найбольшай ахвотай. І справа тут не толькі ў нізкіх заробках — усё куды больш глыбока…

Як быў я… дзіваком

Што ж, дачытваю тэкст, аддаю прадстаўніку выдавецтва і адразу ж задаю пытанне: "Глядзіце: "А.М.", ізноў "А.М.", а вось — "М.М.", "Л.Д."? Без расшыфроўкі? А карыстальніку альбома будзе тое зручна? Маўляў, ён імёны дадумае сам?" "Ну хто ж не ведае Кішчанку і Кашкурэвіча?!" — даводзяць у адказ эканомныя выдаўцы ды ашчадныя заказчыкі (установа культуры, між іншым). Без сумневаў, тое самае сказалі б мне і дасведчаныя супрацоўнікі музеяў, адзінкавыя нашы мастацтвазнаўцы, а таксама практычна рэліктавыя абазнаныя гледачы (хоць, як сведчыць наведванне журналістамі газеты "Культура" мастацкіх выставак у буйных і не вельмі залах, і не абазнаных не набярэцца ад дня, наступнага за вернісажам, і да канца экспазіцыі, каб на пальцах адной рукі падлічыць). Таму я рэзка адказваю тым выдаўцам на іх (ох, як хацелася б, каб яно ўрэшце стала рытарычным!) пытанне: "Ды вобмаль!".

Я і сапраўды досыць песымістычнага меркавання пра рэальны стан дасведчанасці нас з вамі ў дасягненнях айчыннага мастацтва. Не згодныя? У такім выпадку, пад'едзьце у мінскі мікрараён "Усход" да дамоў з мазаікамі аўтарства Кішчанкі альбо да гасцініцы "Турыст" на Партызанскім праспекце з ягонай жа работай на фасадзе (у якім яна цяпер стане?) ды запытайцеся ў дзясятка чалавек рознага веку пра аўтара дэкору (у першым выпадку работа ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей краіны). Колькасць дакладных адказаў і стане цалкам адэкватным працэнтам дасведчанасці. Добра, калі адсоткаў тых будзе дзесяць… Прапанову правесці аналагічны эксперымент з кніжнай графікай Кашкурэвіча я і не выказваю.

…Што ж, апаненты з выдавецтва нічога не парыруюць, але ў іх вачах я выглядаю, мякка кажучы, дзіваком. Па тварах чытаецца літаральна наступнае: "Там "А.М.", тут "А.М."… Галоўнае ж — выдаць і грошы асвоіць, хіба не?.."

Ах, Алег Іванавіч…

Да безыменных творцаў я яшчэ вярнуся. Пакуль жа прапаную зрабіць невялікае адступленне ад заяўленай тэмы, каб пацвердзіць яе актуальнасць. Апавяду, так і хочацца сказаць — показку, але ж насамрэч — рэальны выпадак. У сталічным мікрараёне "Сухарава" ёсць даволі працяглая вуліца Янкоўскага. Яе акурат гэтак і абвяшчаюць у транспарце: "Янкоўскага".

Аднойчы ў тралейбусе пара пасажыраў абмяркоўвала, як жа хутка ў нас ушанавалі памяць знакамітага Мюнхгаўзэна Алега Янкоўскага… Кабета нават слязу змахнула, згадаўшы маладосць… Я, канешне, усміхнуўся сам сабе, але праз пару тыдняў мне тое ж самае сказаў мой знаёмы. Тады я задумаўся: але ж прыяцель неаднойчы праязджаў па вуліцы Янкоўскага, якая мела такую назву яшчэ пры жыцці Алега Іванавіча. Прыжыццёвыя ж помнікі ў нас неяк не прыняты… Не звяртаў увагі сябра? Канешне, бо не мае звычкі на тое, бо ніхто не навучыў. І не вучыць дагэтуль.

> Дык патлумачце, чаму так важна пазначыць дакладны нумар бліжэйшай да прыпынку транспарту паліклінікі (тут і спрачацца не выпадае: важна), але не адзначыць, якую ж асобу і чаму ўганаравалі прысваеннем яе імя гарадской вуліцы?

Чаму ж мы такія? Незацікаўленыя, неахвочыя да новага, не піетэтныя ў сваім стаўленні да мінулага (кажу пра культурную сферу)?.. Вось і тая блытаніна з Янкоўскімі — гэткага ж кшталту форма абыякавасці да дасягненняў сваіх суайчыннікаў (хоць і Янкоўскі-акцёр належыць да выдатнай кінатэатральнай дынастыі, выступаў ён у юнацтве і на сцэне мінскага Горкаўскага тэатра поруч з братам Расціславам, ды, несумненна, варты быць увекавечаным у назве вуліцы, у тым ліку, мяркую, і мінскай). Ну а хто такі лінгвіст і дыялектолаг Фёдар Янкоўскі, ведаюць сапраўды збольшага спецыялісты, і крыху — студэнты-філолагі, калі з кім іншым не пераблытаюць… А шыльда мемарыяльная вісіць на адным з дамоў, ды хто нават з жыхароў апошняга ведае пра яе існаванне ды, тым больш, змест?..

Што за Шырма?

Цікава, што пра наступны прыпынак таго ж самага тралейбуса інфарматар абвяшчае з не меншай інтрыгай: "Вуліца Шырмы". Уяўляеце, пра якую шырму падумала большасць пасажыраў? А колькі — пра этнографа і фалькларыста, заснавальніка Дзяржаўнай харавой капэлы Рыгора Раманавіча Шырму?

Далей па маршруце ідуць "безвестные" Алібегаў, Рафіеў, Любімаў, Бялецкі. У іншым кірунку — Чайлытка (о, як любяць няправільна называць яго прозвішча ў "Мінсктрансе"! А ўсё ж проста: "Чайлыткі", бо ён Леў Львовіч, а не, скажам, Ганна Львоўна!), Мазураў, Адзінцоў, Матусевіч. Кім былі гэтыя людзі? Дык дайце хаця б імёны, каб закінуць у інтэрнэт-пошукавік, калі складана прыдумаць спосаб падачы хоць мінімальнай інфармацыі пра іх у салоне транспартнага сродку, на прыпынку альбо праз галасавы інфарматар (прадказваю сустрэчнае пытанне: а хто за ўсё гэта мае адказаць: ідэолагі ці транспартнікі з гарадскіх структур?)! Затое два прыпынкі ля паліклінік па тым жа маршруце абвяшчаюцца ўжо не так, як колькі гадоў таму, калі падобных аднайменных пунктаў было з пару дзясяткаў на сталіцу, а цалкам канкрэтна: "Паліклініка № 25" і "Паліклініка № 26". Адчуйце розніцу!

Пашанцавала на той тралейбуснай трасе хіба вуліцам нашага літаратурнага класіка Максіма Гарэцкага і, з нядаўняга часу, класіка слова рускага Сяргея Ясеніна. Абвяшчаюць іх з імёнамі. А вось на шыльдах, што на дамах, пакуль блытаніна: дзесьці "Ясеніна", у іншым месцы — "С.Ясеніна", а сям-там — ужо і "Сяргея Ясеніна". Які-ніякі, а прагрэс!

А як выдатна быць акадэмікам! Вось, скажам, на тых самых заходніх ускраінах Мінска маюцца вуліцы акадэміка Фёдарава і акадэміка Жэбрака, на усходзе — акадэміка Купрэвіча. Так і абвяшчаюць іх са статусным "акадэмік". А вось вуліца народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі на шыльдах пазначана толькі прозвішчам, а ў транспарце, у залежнасці ад версіі абнаўлення інфарматара на маршруце, — то "Пімена Панчанкі", то "Панчанкі". Лішне казаць, што "суседу" па ўскраінным жылым масіве — народнаму пісьменніку Івану Шамякіну — "пашанцавала" не больш…

Аплата за Панчанку дапаможа?

Дык патлумачце, чаму так важна пазначыць дакладны нумар бліжэйшай да прыпынку транспарту паліклінікі (тут і спрачацца не выпадае: важна), але не адзначыць, якую ж асобу і чаму ўганаравалі прысваеннем яе імя гарадской вуліцы? Хіба так цяжка дапісаць у тэкст дыктару пры запісе: "Вуліца мастака і кампазітара Напалеона Орды", "Вуліца народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі", "Вуліца заслужанага будаўніка Льва Чайлыткі" ці "Вуліца паэта Яна Чачота"? Так, запатрабуе тое большай аплаты працы агучвальніка. Безумоўна, абвестка стане гучаць на колькі секунд даўжэй (дык затое — не абрыдлая рэклама!).

> Ці вядомыя вам такія беларускія мастакі, як Кішчанка і Кашкурэвіч (пішу наўмысна без імёнаў)? У згаданым альбоме будзе прадстаўлена па рабоце кожнага. І подпісы перад назвамі твораў: "А.М. Кішчанка" і "А.М. Кашкурэвіч". І ў тэксце ўступных артыкулаў гэтак жа. Такім чынам, на ўвесь альбом — ніводнага выпадку поўнага напісання імён гэтых творцаў. Зрэшты, як і ўсіх астатніх там прадстаўленых з ліку дзеячаў беларускага мастацтва.

Навошта ўсё гэта патрэбна? Ды каб была нагода ганарыцца! І апраўдаць хоць на каліўца змест патэтычных і ў большасці сваёй стала абязлічаных бігбордаў пра "мой горад" і "ганаруся Мінскам". А яшчэ — каб прыйсці ў бібліятэку, кнігарню ці нават адкрыць акенца інтэрнэт-пошукавіка ды даведацца, што ж такое напісалі Панчанка, вядомы са школьнай лавы, ды Орда, чыё імя адкрыта шырокай грамадскасці не так і даўно. Менавіта такім чынам, нават праз выпадкова пачутае імя, абыдзённую сітуацыю, пачынаецца прызнанне. На мой погляд, нашым славутым імёнам якраз яго і не стае не ў фармальным, а ў рэальным плане.

Але ж аргумент на гэтыя культуралагічна-ідэалагічныя меркаванні ў адказ будзе, відаць, адзіны: "Праграмамі пераагучвання не запланавана, сродкаў не прадугледжана". І, не для прэсы, фраза кшталту: "Скажыце дзякуй, што паціху вуліцы з імёнамі называем". А за гэта і сапраўды дзякуй! Апроч названых мной вышэй дадам прыклад з новапабудаваных "Каменнай Горкі" і "Дамброўкі": скажам, вуліца Іосіфа Жыновіча, якая, праўда, суседнічае з вуліцай проста Калеснікава. Дык дзе шукаць сістэму?

Памятаецца, калі вывучаў пяць гадоў беларускую мову ў ВНУ, пра яе — сістэму — казалі ці не на кожнай пары па кожным прадмеце. Цікава, няўжо ў навуках транспартнікаў было інакш? Урэшце, адзіны паслядоўны выпадак той самай сістэмы я ўсё ж зафіксаваў: калі прозвішча (альбо псеўданім) у асобы, у гонар якой названа вуліца, сугучныя з агульным назоўнікам. Так, відаць, і з'явіліся вуліцы Якуба Коласа, Максіма Танка, Уладзіслава Галубка і Кандрата Крапівы. Урэшце, Шырму, згаданаму вышэй, тут пакуль не пашчасціла…

Скарачалі і скарачаем…

Але ж вернемся да мастакоў А.М. і А.М. Пазнавальныя ініцыялы, ці не так? Але прэч жарты ды іронію! Аддаўшы тэкст пасля прагляду ў выдавецтва, настойліва параіў яго кіраўніку ўсё ж звярнуць увагу на поўную адсутнасць імёнаў нашых мастакоў у альбоме. І дадаў: усё ж адна справа, калі мастака называем "ну, той, што пейзажы малюе", ды іншая, калі называем прозвішча — і цалкам сітуацыя змяняецца, калі мы можам сказаць "Селяшчук", а можам — "Мікола Селяшчук". Бо ведаем, як ягонае імя, а значыць — шануем. Пагадзіцеся, нават кажучы пра Далі, Шагала, Ленана, "па змоўчанні" памятаем, што першага клікалі іх Сальвадорам, Маркам, Джонам. Гэта, паўтаруся, знак павагі, заслугі.

І не пагаджуся, што тут усё сапсаваў савецкі час і савецкая ж традыцыя з неадольным імкненнем да празмерных скарачэнняў. Перыяд той мінуў больш як два дзясяткі гадоў таму. Але... Што ні выданне, прывезенае з чарговага фестывалю, свята, дык гісторыя раёна больш нагадвае для госця які інтэлектуальны турнір з заданнем расшыфраваць пару соцень ініцыялаў.

І, мяркую, называючы любога артыста расійскай сцэны, мы без праблем прыгадваем імя і прозвішча. А ў нас? Нядаўна пабачыў кінастужку, якой ужо споўнілася гадоў сорак, дык у ёй здымаліся "Г.Гарбук" і "Г.Аўсяннікаў". Ці нармальнае такое абазначэнне? Мяркую, не. Ды ўсё ж на сучасным тэлебачанні і ў кіно традыцыя — пісаць імёны і прозвішчы. А што ж у друку? Так, і ў "Культуры" такія моманты скарачэнняў існуюць. Але адна справа, калі імя ды прозвішча паўтараюцца ў тэксце не адзін раз, і іншая — калі яно ўзнікае аднойчы з ініцыяламі — і на тым яго няма. Апошнія выпадкі станем пільнаваць больш уважліва.

■■■

Як там у паэта? "Імёны — адно на мільён дастаткова". На шчасце, імёнаў у нас куды больш. Давайце іх называць і ўжо тым шанаваць. А то, глядзіш, станем апазнаваць сваіх творцаў па газеце ў руках і казаць: "Ну, гэты, які…". Замест шматкроп'я дапішыце вызначэнне самі.

К

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77,
альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby,
twitter.com/kimpressby
odnoklassniki.ru/group/52156879339702

Спектакль **"Паўлінка"** Купалаўскага тэатра традыцыйна адкрые сезон трупы, але ў Томску, гастролямі ў якім ён і пачнецца.

Тэатральная плошча

Адным з мастацкіх адкрыццяў сёлетняга "Славянскага базару ў Віцебску" стаўся начны пленэрны паказ шэкспіраўскага "Макбета" ў пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Прымеркаваны да 450-годдзя з дня нараджэння класіка, гэты "выязны" спектакль абвергнуў усе нашы ўяўленні пра падобныя імпрэзы ў рэжыме open air — на адкрытым паветры.

Вядзьмаркі ў Здраўнёве

Надзея БУНЦЭВІЧ

Падумаеш, скажаце вы, той жа Вялікі тэатр Беларусі, нахапаўшыся замежнага гастрольнага досведу, ужо пяць гадоў запар ладзіць не проста асобныя паказы, а цэлы фестываль у Нясвіжы, дзе оперныя і балетныя спектаклі, а таксама гала-канцэрты ідуць, у тым ліку, ля сцен Палаца. Падобны фестываль у радзівілаўскім маёнтку маюць і драматычныя тэатры. Дый наш Музычны тэатр тройчы рабіў чэрвеньскія выезды ў Строчыцы. Там нават прэзентаваўся мюзікл Уладзіміра Кандрусевіча "Соф'я Гальшанская", сёлета паказаны яшчэ і ля сцен Гальшанскага замка. Традыцыйнымі сталі і цыклы эстрадных канцэртаў "Вечары ў Мірскім замку", якія ладзяцца тэлебачаннем. Усё так, але гэтыя паказы з'яўляюцца, па сутнасці, крыху адаптаваным пераносам пастаноўкі на спецыяльна збудаваную сцэну, з-за чаго, бывае, страчваецца большая частка сцэнаграфічнага рашэння. А што ж у Здраўнёве?

Сцэнічнай прасторай стала вялізная паляна паміж аднаўленай сядзібай Ільі Рэпіна (а гэта сапраўдны церам у некалькі паверхаў) ды гаспадарчым збудаваннем (насамрэч, невялікай хаткай) для персаналу. Мокрая пасля дажджу трава, кустоўе, дрэвы, вецер, які то ўздымаўся, то крыху сціхаў, — усё гэта і стала рэальнай жывой сцэнаграфіяй. Замест звыклага партэра — штосьці накшталт міні-амфітэатра прыкладна на 400 месцаў, якія абкружалі сцэнічны эліпсіс з усіх бакоў: першы рад — нізенькія лавачкі, другі-трэці — больш высокія крэслы, чацвёрты — на подыуме. Артысты цудоўна абжывалі нязвыклую для іх прастору — вялізную, адкрытую з усіх бакоў, дзе не схаваешся на фоне задніка. Ніякіх франтальных мізансцэн, нават увогуле звыклых "зваротаў" у залу, што так любяць артысты, — толькі непасрэдныя зносіны паміж сабой, сведкамі чаго становяцца гледачы. Таму ніхто не назіраў дзею адно "са спіны" — добра бачна было з любога месца. Трэба было бачыць, як Лэдзі Макбет (Анжаліка Баркоўская) у сцэне вар'яцтва босая, у адной сарочцы, каталася ў мокрай траве! Ці як яны з Макбетам (Юрась Цвірка) прызнаваліся адно аднаму ў каханні, нахіляючы-адхіляючы галінку і размаўляючы "праз" лісце на ёй… Частка дзеі пераносілася на балкон сядзібы, забойствы адбываліся ў хатцы насупраць — праз чырвань вокнаў праступалі цені…

Немагчыма паверыць, але "на пленэры" было ўсяго дзве рэпетыцыі: дзённая і вечаровая, ужо са святлом. Пульт увогуле прывезлі непасрэдна да пачатку, бо забіралі яго з тэатра пасля паказу там спектакля антрэпрызы. Але і сам тэатр, і ягоны дырэктар — мастацкі кіраўнік і адначасова пастаноўшчык "Макбета" Валерый Анісенка рыхтаваліся да гэтага паказу ў Здраўнёве куды больш доўгі час. Год таму ў падобным "лугавым" рэжыме яны паказвалі "Макбет" на Міжнародным тэатральным фестывалі "Мельпамена Таўрыі" ў Херсоне (гэта была, дарэчы, прэм'ера спектакля). Пачатак жа быў пакладзены ў 1996-м, калі Анісенка са сваім ранейшым "Макбетам", пастаўленым у іншым тэатры, выязджаў на пленэр не куды-небудзь, а ў Шатландыю, на знакаміты Эдынбургскі фестываль!

Цяперашні "Макбет" (праўда, у традыцыйным сцэнічным варыянце) быў адзначаны ў красавіку на IV Міжнародным "Смаленскім каўчэгу" за лепшую рэжысуру. Калі б тое журы ўбачыла здраўнёўскую "лясную версію", дык не пасквапілася б і на Гран-пры. Спектакль пачынаўся адразу, ледзь толькі гледачы, сышоўшы з аўтобусаў, якія падвозілі іх да месца і назад, рушылі па дарожцы. Спачатку — фальклорны ансамбль, які задае святочны фестывальны тон. Але ўжо праз некалькі крокаў, па кантрасце, — "прывіды Сярэднявечча" з паходнямі ў руках. Яны не столькі асвятляюць шлях, колькі пужаюць ужо самім сваім выглядам. А тут яшчэ абапал, у лясным гушчары, пачынаюць бегаць чорныя здані з сіва-папялістымі валасамі, раз-пораз урываючыся ў натоўп з жудаснымі крыкамі. Страшна — і весела, як на Хэлаўіне, бо разумееш, што ўсё гэта — гульня. Раптам хтосьці наперадзе пачынае зусім не па-тэатральнаму крычаць: "Дапамажыце!" — і, міжволі паскорыўшы хаду, мы становімся сведкамі дзіўнага, быццам справакаванага "цёмнымі сіламі", самазабойства: на дрэве — вісельнік, пад ім — перакулены зэдлік. Тая ж атмасфера поўні, таямнічасці, сярэднявечнай англійска-шатландскай "туманнасці" з вядзьмаркамі ды прывідамі падтрымліваецца да пачатку спектакля, перацякаючы ў яго пачатковую сцэну вядзьмарскіх прадказанняў. Вядома, "ляснымі духамі" ў такой "уверцюры" пераапранулі навучэнцаў Віцебскага каледжа культуры і мастацтваў. Але сярод іх апантана бегалі і артысты тэатра розных узростаў, уключаючы такіх знакамітых, як, да прыкладу, Раіса Грыбовіч. Адно гэта сведчыць аб тым, які ўздым быў у трупе!

Сцэны з пленэрнага спектакля "Макбет" у Здраўнёве. / Фота Марыны КАТЛЯРОВАЙ

Страшна — і весела, як на Хэлаўіне, бо разумееш, што ўсё гэта — гульня. Раптам хтосьці наперадзе пачынае **зусім не па-тэатральнаму крычаць**: "Дапамажыце!"…

Сцэнічная рэдакцыя, накіраваная на значнае скарачэнне вялізнай п'есы, і даволі вольны пераклад на беларускую мову, зроблены Аляксеем Дударавым, яшчэ больш вострa ды сканцэнтравана праводзяць думку пра выпрабаванне ўладай, пры якім важна застацца чалавекам. Музычнае афармленне Уладзіміра Кандрусевіча, пластыка Дзіяны Юрчанка настолькі натуральныя, што становяцца літаральна незаўважнымі, яднаючыся з гукамі-рухамі прыроды і воклічамі душы. Сцэнічныя строі Ніны Гурло знітоўваюць даўніну і сучаснасць так, што не бачна швоў. Усе акцёры — з маленечкімі, прычэпленымі да адзення мікрафонамі, якія выкарыстоўваюцца ў тэлестудыях. Артысты не іграюць — жывуць сваімі персанажамі. Замест паказной тэатральнай пафаснасці — жывыя пачуцці і жарсці, ад злавеснага шэпту да пульсуючай цішыні ці звярынага крыку душы. Больш за паўтары гадзіны без перапынку пралятаюць на адным дыханні! Ды ўсё ж фінал спектакля, на маю думку, патрабуе далейшай працы. Пакуль тут проста канстатуюцца факты: Макбет забіты, на ягоным месцы — новы кароль. Шматкроп'я, якое непазбежна ўзнікае праз стагоддзі, не атрымліваецца. Можа, "віной" яшчэ і паспяховы паказ? Бо ў фінале, насамрэч, прысутныя ўслаўляюць не столькі караля ці Макдуфа, колькі трупу.

На вышыні аказаўся і арганізацыйны бок гэткага складанага мерапрыемства. Білеты на спектакль можна было набыць не толькі загадзя, але і непасрэдна пры пасадцы ў адзін з трох аўтобусаў, якія ад'язджалі ад тэатра адначасова, пачакаўшы літаральна хвілін пяць-сем тых, хто спазняецца. Спектакль пачаўся а 23-й, без аніякіх затрымак. Па яго заканчэнні гледачоў гэтак жа зладжана вярнулі назад, да тэатра, робячы на дарозе некалькі прыпынкаў для тых, хто хацеў бы сысці. А як шкадавалі тыя, хто пабаяўся халадэчы! І ў адзін голас пыталіся, калі чакаць паўтору. Сапраўды, калі?..

К

Думкі Валерыя Анісенкі пра магчымасці тэатральных пленэраў чытайце **ў наступных нумарах "К".**

Мастыхін

"Дыялогі" без перакладчыка

У галерэі "Панарама", што месціцца пад самым дахам Нацыянальнай бібліятэкі, праходзіла сумесная выстаўка работ навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава і Аб'яднання дзяржаўных школ выяўленчага мастацтва імя Т.Макоўскага ў Лодзі. Экспазіцыя мела назву "Дыялогі".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Анэта Прашоўска. Вучэбная кампазіцыя.

Н.Сілік. "Радзівілаўскія забавы".

Выстаўкі работ польскіх творцаў, якія сцвердзіліся як знакавыя асобы ў культурнай прасторы сваёй краіны, для Мінска, для Беларусі — не рэдкасць. А вось тое, як у Польшчы вучаць будучых мастакоў, вядома хіба што нашым спецыялістам педагагічнай справы. Дадзеную экспазіцыю складаюць творы, якія адлюстроўваюць асаблівасці навучальнага працэсу ў дзвюх установах. Работы навучэнцаў па вызначэнні не могуць быць цалкам самастойнымі. Жывапіс, дызайн і скульптура, прадстаўленыя ў экспазіцыі, распавядаюць пра эстэтычныя арыенціры аўтараў і ступень творчай свабоды, магчымай у рамках навучальнага працэсу. Той, хто ведае почырк мастакоў, якія выкладаюць у "Глебаўцы", заўважыць іх уплыў у работах навучэнцаў. Мабыць, тое ж і ў лодзінцаў. У беларускай частцы экспазіцыі пераважаюць работы, напісаныя па-за навучальнай праграмай. Творы ж польскіх аўтараў глядзяцца як ілюстрацыі да методыкі выкладання: вучэбны малюнак, вучэбны жывапіс, заданне па кампазіцыі…

Відавочна, праграмныя чыннікі ў беларускай і польскай мастацкіх школах часткова супадаюць. А што да адрозненняў, дык яны абумоўлены культурнымі прыярытэтамі кожнай краіны. У нашых каледжах і ВНУ прадметам, якія называюць спецыяльнымі, надаецца вялікая, а калі-нікалі — і выключная ўвага. Вучня арыентуюць на класічныя ўзоры. У Польшчы ж, мяркуючы па дадзенай экспазіцыі, да гэтага чынніка прафесійнай адукацыі ставяцца больш памяркоўна. У рамках навучальнага працэсу дапускаецца больш вольная трактоўка формы і гульня з колерам. Відаць, трэба браць да ўвагі тую акалічнасць, што Лодзь — гэта адзін з найбуйнейшых прамысловых цэнтраў Польшчы, і традыцыйная мастацкая трыяда (жывапіс — графіка — скульптура) тут шчыльна спалучана з дызайнам. А дызайнеру класічная мастацкая адукацыя, відаць, не надта пасуе.

У нас прафесійнае мастацтва звыкла арыентавалася на рускую класіку, а калі мода змянілася, папулярнасць набыў рускі авангард. У Польшчы ж заўжды ў пашане была французская школа, у прыватнасці — імпрэсіянізм. Хай не наўпрост, але гэтая традыцыя адчуваецца і ў работах навучэнцаў.

Дыялог, замоўлены ў назве выстаўкі, — гэта не толькі сумоўе маладых аўтараў, некаторым з якіх наканавана з часам заняць годнае месца ў "дарослым" мастацтве. Гаворка ідзе пра перспектывы дыялога роднасных культур. Мастакі з Польшчы неаднойчы бралі ўдзел у беларускіх пленэрах, дый нашы творцы ў краіне-суседцы — людзі не чужыя. Дык няхай жа творчае сумоўе пачынаецца як мага раней: з гадоў навучання!..

Беларусь і Польшча — гэта дзве дзяржавы, якія калісьці складалі адзіную прастору — Рэч Паспалітую, а сёння з'яўляюцца раўнанапраўнымі яе "спадкаемцамі". Знаходзячы, пры розных эстэтычных арыенцірах, ментальную тоеснасць у работах маладых беларусаў і палякаў, я падумаў, што мы не надта змяніліся з тых часоў. Прынамсі, адно аднаго разумеем без перакладчыка. Да таго ж творчыя кантакты такога кшталту спрыяюць развіццю вельмі важнага для беларускага мастацтва заходняга вектара…

К

Мінскі міжнародны кінафэст **"Лістапад"** (7 — 14 лістапада), прымае заяўкі фільмаў на адбор за два месяцы да пачатку падзеі.

Бамонд: опера, балет

Лета балета з вербацімам

Сезон у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета завершаны. Але ўражанняў ад новага міжнароднага праекта "Балетнае лета ў Вялікім", што вянчаў ліпеньскую афішу, хопіць да пачатку наступнага.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Шэсць вечароў, 12 спектакляў (дзевяць з іх — аднаактовыя) і гала-канцэрт. Усё — пры аншлагах. Удзельнікі з сямі краін: акрамя нашай трупы, прыезд Грузінскага балета (ажно на некалькі дзён, як паўнавартасныя гастролі), а таксама салістаў з Азербайджана, Германіі, Даніі, Польшчы, Расіі. Беларуская харэаграфія была прадстаўлена прэм'ерным "Вітаўтам" (ён адкрываў той сезон, а цяпер вылучаны на Нацыянальную тэатральную прэмію), рэдакцыяй класічных пастановак і асобнымі нумарамі ў фінальным канцэрце. Маленькія ды вялікія адкрыцці, пераважна прыемныя, чакалі публіку на кожным паказе.

Лебедзі на возеры слёз

"Лебядзінае возера" выклікала настальгію. Найперш — па ранейшай рэдакцыі гэтага балета ў нашым тэатры. Прымаючы яе як дадзенасць, мы неяк не асабліва задумваліся, што ў свеце існуе безліч не толькі найноўшых, але і адрозных класічных пастановак гэтага балета, заснаваных на харэаграфіі Марыуса Пеціпа з яе далейшымі ўдасканаленнямі Льва Іванава і Аляксандра Горскага. У нашым тэатры да мінулага года спектакль ішоў у рэдакцыі Валянціна Елізар'ева, і некаторыя нават пасмейваліся: маўляў, пры чым тут ягонае імя? Ацаніць напоўніцу, што было ім зроблена, магчыма толькі ў параўнанні — не толькі з цяперашняй версіяй, да якой спрычыніліся Юрый Траян і Аляксандра Ціхамірава, але і з іншымі, што ідуць у розных тэатрах.

Фінальная дзея ў нас ішла з харэаграфіяй Асафа Месэрэра, упершыню ўвасобленай у Маскве ў перадваенны час. Дзякуючы гэтаму Зігфрыд набываў рысы ваяра, здольнага кінуць выклік магутнаму Ротбарту. Вобраз прынца сімвалізаваў паступовае сталенне героя — ад няясных мрояў пра каханне да неабходнасці адстойваць яго, нават у няроўным паядынку. А няўлоўныя, ды вельмі трапныя дэталі, асэнсаваныя і пераасэнсаваныя Валянцінам Елізар'евым, надавалі ўсяму спектаклю логіку паводзін кожнага з герояў.

Новая рэдакцыя Траяна і Ціхамiравай цалкам адпавядае сучаснасці. Балет, пры ўсіх яго кананізаваных фрагментах, наблізіўся да жанру мыльнай оперы, пазбаўленай не толькі элементарнай логікі, але і сэнсу. У фінале Зігфрыд і Адэта амаль не танцуюць — яны стаяць, забыўшыся на харэаграфію, але шчыльна прыціснуўшыся адно да аднаго. Мяркуючы па лібрэта, гэта павінна навесці гледача на думку, як горача яны кахаюць, бо згодныя памерці разам, а не па чарзе. Праўда, асабіста мяне такі ход не ўразіў. А вось Ротбарда — яшчэ як! Ён таксама раптам забыўся на класіку, пачаў гойсаць па падлозе ды біцца ў канвульсіях.

Пры ўсіх недарэчнасцях новай рэдакцыі, саліст Марыінскага тэатра і былы выхаванец нашага харэаграфічнага каледжа Ігар Колб знайшоў для Зігфрыда свае фарбы. У першай дзеі яго герой — зусім не летуценны інтраверт, якому паляванне мілейшае за жанчын, а поўны жыцця і кахання юнак, які проста не ведае, на якой з аднолькава прывабных прыгажунь спыніць свой выбар. Сустрэўшы на возеры Адэту, не падобную на іншых, у сцэне ракавога балю ён прагна шукае яе — літаральна ў кожнай дзяўчыне. Адэта-Адзілія ў выкананні салісткі Вялікага тэатра Расіі Крысціны Крэтавай атрымаліся сапраўднымі блізнятамі, блізкімі па характары: абедзве — упэўненыя і "дзелавыя", бы адная і тая ж гераіня, якая наўмысна ўводзіць абранніка ў зман, каб потым маніпуліраваць ім, карыстаючыся яго пачуццём віны.

Героямі "Дон Кіхота" выступілі яшчэ двое салістаў з Масквы: тэмпераментная заслужаная артыстка Азербайджана Чынара Алізадэ і Міхаіл Лабухін, які сваім артыстызмам мог бы пераўзысці спрактыкаванага кінаакцёра. Фрагменты з гэтых балетаў былі ўключаны і ў праграму гала-канцэрта, прычым з нашымі салістамі. У гэтым негалосным спаборніцтве перамаглі, мяркую, нашы. Вольга Гайко надзяліла сваю Адэту кранальнай жаноцкасцю. Канстанцін Кузняцоў, які напярэдадні фестывалю атрымаў званне народнага артыста Беларусі, зрабіў Базіля гэткім элегантным мача, які ўскідваў Кітры (Кацярына Алейнік) на адной руцэ ды яшчэ і "фіксаваў" яе ў паветры на некалькі секунд. А тая канчаткова скарыла сваімі "фірменнымі" падвойнымі фуэтэ. Калі хто і прайграў, дык гэта найперш кардэбалет. Яшчэ некалькі гадоў таму ўсе яго артысты танцавалі на ўзроўні салістаў, салісты ж вылучаліся не столькі школай, колькі сваёй творчай індывідуальнасцю. Цяпер — салістамі становяцца не толькі яркія асобы, але і тыя, хто мае і не страціў добрую падрыхтоўку. А кардэбалет — ды некаторыя элементарна "спінку не трымаюць", не кажучы пра неабходную сінхроннасць і роўнасць ліній! Таму з'яўленне такога фестывалю карыснае ўжо тым, што вымусіць нашых лебедзяў-лябёдачак "падцягнуцца".

Таямнічы след сучаснасці…

Цэнтрам "Балетнага лета…" сталі, безумоўна, гастролі Тбіліскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя З.Паліяшвілі. Тры вечары Грузінскага балета не толькі цалкам прысвячаліся харэаграфіі ХХ — ХХІ стагоддзяў, але і былі тэматычнымі: першы — спектаклі Джорджа Баланчына, другі — Іржы Кіліяна, трэці — пераважна грузінскія нацыянальныя пастаноўкі. Кожны з вечароў дапаўняўся ці нашым спектаклем вышэйзгаданых сусветна вядомых харэографаў, ці ўдзелам некаторых нашых салістаў "у складзе" грузінскай трупы (Ігар Артамонаў даўно ўжо паспяхова выступае ў пары з Нінай Ананіяшвілі, а Артур Іваноў тэрмінова замяніў захварэлага грузінскага артыста, бо "мігрыраваў" да нас з тбіліскага тэатра і ведае той рэпертуар). І гэта надавала гастролям яшчэ і адценні то супрацоўніцтва, а то і творчага спаборніцтва. Нам было чаму павучыцца ў гасцей: кірунку на сучасныя плыні (дарэчы, "Сэрэнада" і "Шэсць танцаў" узніклі ў нашай афішы, можна сказаць, "па рэкамендацыях" Ніны Ананіяшвілі), сапраўднай еўрапейскай стыльнасці ў іх выкананні, уменню "хаваць" магчымыя недахопы кардэбалета з дапамогай рэпертуару, сцэнаграфіі (і асабліва асвятлення), касцюмаў. А яшчэ — бліскучым спалучэнням сучаснай харэаграфіі з нацыянальнай тэмай. "Таямнічы сад" і "Сагалабелі" (апошні балет мы глядзелі ўжо другі раз — і з не меншай цікавасцю, чым на колішніх гастролях) паўсталі выкшталцонымі фестывальнымі кампазіцыямі, поўнымі харэаграфічных знаходак, філасофскага сэнсу і годнымі лепшых сцэн свету.

Сцэна са спектакля "Таямнічы сад".

"Тэматычным" можна было назваць і гала-канцэрт. Наша балетмайстар Вольга Костэль зрабіла яго цэлым спектаклем з выкарыстаннем тэхнікі "вербацім", што стала моднай у драматычным тэатры. За кадрам гучалі дакументальныя запісы галасоў нашых артыстаў, якія распавядалі пра свой "шлях у балеце" — ад першых заняткаў да цэнтральных партый і… траўмаў, падзенняў, іншых рызык гэтай прафесіі. Атрымалася штосьці накшталт збіральнага вобраза артыста балета, ягонага "цяжкага шчасця", метамарфоз жыцця і лёсу. Твары інтэрв'юіраваных з'явіліся на экране толькі ў канцы — замест цітраў. Прысутнасць у некаторых момантах на сцэне дзяцей дадало аповеду яшчэ адну лінію — працягу традыцый новымі пакаленнямі. А відэавыявы на экране не толькі ўтрымлівалі дзіцячыя партрэты нашых цяперашніх салістаў, але і, разам з трыма опернымі фрагментамі, надавалі канцэрту "касмічнасці".

Харэаграфія сучасных нумароў, сабраных у другім аддзяленні, была рознай. Побач са стыльнымі нумарамі сустракалася і крыху эклектыкі. Але было заўважна, што, кідаючыся ад неакласікі да эстрады, тая ж Вольга Костэль імкнецца знайсці свой почырк. Побач з удалымі замежнымі пастаноўкамі выбудавалася і лінія пераемнасці айчынных майстроў: ад таго ж Елізар'ева да ягонага выхаванца Раду Паклітару і, далей, да Юліі Дзятко і Канстанціна Кузняцова, якія праз супрацоўніцтва з апошнім і выкананне яго кампазіцый прыйшлі да ўласных пастановак. Пры ўсім палёце фантазій (у кожнага — сваіх), іх аб'ядноўвае асаблівае ўменне слухаць, чуць і тонка адчуваць музыку, ствараючы на яе аснове "сімфанізаваную" харэаграфію, заснаваную на развіцці пластычных элементаў-зерняў. А сам канцэрт засведчыў перспектыўнасць гэтага жанру. Чаму б і надалей не практыкаваць у тэатры штосьці падобнае? Зусім не абавязкова з запрашанымі зоркамі.

Чынара Алізадэ і Міхаіл Лабухін у балеце "Дон Кіхот". / Фота прадастаўлена тэатрам

…і будучыні

Заўтра новага фестывалю выклікае пытанні-хваляванні. Як запэўніў генеральны дырэктар тэатра Уладзімір Грыдзюшка, праз некалькі гадоў у рамках "Балетнага лета…" плануецца міжнародны конкурс — як гэта адбылося з нашым Калядным оперным форумам. Але пакуль наша балетнае свята яшчэ толькі намацвае далейшы шлях. Невыпадкова ў ім сумясціліся тры розныя фестывальныя ідэі. Адна — запрашэнне замежных зорак у спектаклі бягучага рэпертуару. Другая, куды больш фінансава ёмістая, — паказ спектакляў іншых тэатраў. Трэцяя — кірунак на сучасную харэаграфію, запатрабаваную ва ўсім свеце. Дык па якой сцяжынцы будзем рухацца далей? Ці, можа, знойдзем чацвёртую, пятую? Як бы тое ні было, а пошукі адметнай канцэпцыі, прыцягальнай на фоне сусветнай фестывальнай разнастайнасці, — справа не аднаго дня…

К

Каля 7 тысяч прадметаў знойдзена ў час раскопак у Мсціславе, а раскоп плануецца зрабіць **музеем пад адкрытым небам**.

Акцыя “К”: журналісцкі аўтапрабег па СДК і не толькі



Які клуб назавём “рабочым”...

Асуджаныя на

Культура Міншчыны для нас абодвух — амаль нязведаная. Да “аўтапрабежных” часін рэдакцыйнае кіраўніцтва камандзіравала нас спрэс у аддаленыя раёны Беларусі. Маўляў, Мінская вобласць — “сякера” пад лавай: у любы час можна дастаць ды палюбавацца адточанай завостранасцю прысталічнай культурнай “прылады”. Выснова прыгожая, але, як аказалася, не вельмі дакладная. Прынамсі, першыя дні аўтаваяжу па Міншчыне прынеслі нам не толькі станоўчыя эмоцыі...

Агаворымся, забягаючы наперад, што змест публікацый па выніках нашага ліпеньскага аўтатура тычыцца не столькі аптымізацыі, колькі прафесіяналізму альбо поўнай яго адсутнасці. Пытанне, як нам падаецца, — ці не самае на сёння надзённае і для сельскай культуры лёсавызначальнае.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ
Мінск — Мінская — Гомельская — Брэсцкая вобласці — Мінск

Як нараджаюцца зоркі?

Узда ўразіла. І не толькі “стрыечным архітэктурным братам” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — мясцовым Палацам культуры, што ўвесну быў уведзены ў эксплуатацыю. Так, у гэты прывабны “бурштынчык” укладзены немалыя грошы. Але творча-камерцыйныя магчымасці новай ўстановы культуры павялічыліся неймаверна. Як нам паведамілі мясцовыя работнікі культуры, з вясны прэс платных паслуг на СДК і СК стаў не такім заўважным і хваравітым: асноўны цяжар “пазабюджэткі” ўзяў на сябе Палац культуры (РЦК) з сонечнымі паверхамі, бясконцымі кабінетамі, шыкоўнай сцэнай і карціннай галерэяй. Але не толькі пра гэта наш расповед…

Нас уразіў Алег Каламіец, загадчык метададдзела Уздзенскага РЦК і выконваючы абавязкі яго дырэктара. Чаму? Ды таму, што сустрэча з прафесіяналам заўжды прыносіць радасць самых нечаканых адкрыццяў, на якія журналісты рэагуюць прыблізна так, як жвавы шчупак на соннага карася… Тут самы раз паразважаць пра тое, што ж такое прафесіяналізм. Мы пераканаены: якасць гэтая набываецца не толькі цягам гадоў навучання (няхай сабе і ўніверсітэцкага), а яшчэ і паступовым назапашваннем практычнага досведу. Усе нашы сённяшнія “зоркі” ад сельскай культуры пачыналі харэографамі, акампаніятарамі, мастацкімі кіраўнікамі. Каламіец дванаццаць гадоў адпрацаваў у раёне кіраўніком СДК. І мы не баімся яго перахваліць, бо спецыяліст даўно расклаў па паліцах усё, што яму трэба для працы, ведае сабе цану, працягвае вучыцца і не баіцца агучваць праблемы, бо лічыць нас аднадумцамі. Такіх лаяць — толькі псаваць.

Якая гэта ўстанова культуры і дзе яна знаходзіцца? Адказ просты: Палац культуры ва Уздзе.

Праблем няма толькі ў абібокаў

Дык вось, на Уздзеншчыне — амаль два дзясяткі клубных устаноў. Апрача СДК ёсць сельскі клуб, Цэнтр вольнага часу і бібліятэка-клуб. Безумоўна, кадравае пытанне — самае балючае. Пры адсутнасці належных заробкаў рэй неўзабаве стануць весці дылетанты, а аб прафесіяналах застануцца хіба што легенды… Абслугоўваюць сельскую “армію” два (!) метадысты, адзін з іх — паўставачнік. Ёсць яшчэ ў аддзеле кіраўнік клуба майстроў і “рамесніцкі” метадыст. Вось і ўвесь штаб, які павінен натхняць ды накіроўваць. Зразумела, што з названымі абавязкамі структура ледзь спраўляецца. Для выніковай працы патрэбны хаця б чатыры метадысты, яшчэ адзін камп’ютар, больш магутны прынтар, належны аўтаклуб. Не, “Пежо” ёсць, але без генератара і музычнай тэхнікі. Увогуле, недахоп апаратуры — даўняе захворванне сельскіх устаноў. Толькі сем з іх так-сяк прыстасаваны для дыскатэчнай дзейнасці.

І рок-гурт “Кандраты”

Малады загадчык метададдзела добра ведае, у якім напрамку варта рухацца раёну. Патрэбны маніторынг, скіраваны на брэндазабеспячэнне кожнага клуба. Да прыкладу, ужо цяпер добра вядома, што галоўная адметнасць Хатлянскага СДК — ткацтва, Дзешчанскага — сімбіёз аматарскай творчасці і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва… А вось Возерскі сельскі дом культуры праславіўся рок-гуртом “Кандраты”. Хлопцы, памятаючы творчыя запаветы земляка Кандрата Крапівы, уласны рэпертуар складаюць сваімі сіламі і спяваюць выключна на роднай мове. На базе гэтай установы запланавана правядзенне раённага семінара-практыкума па развіцці вакальна-інструментальнай творчасці…

Мы пахадзілі па Палацы, у якім працуюць 23 фарміраванні, зазірнулі ў галерэю, дзе творы мастакоў з Мінска і Узды выстаўлены пад агульнай назвай “Паміж Нёманам і Уздзянкай”, памроілі пра тое, што такія ўстановы займее кожнае беларускае сяло. Калі? Прыкладна тады, калі заробак работніка культуры будзе адпавядаць высокаму прызначэнню апошняга і калі вёска перастане сарамліва знікаць у культурным плане пад маркай аптымізацыі.

Імя Паўлюка Труса

Раённая і дзіцячая бібліятэкі таксама месцяцца пад дахам Палаца. Мы бачылі, як бабулі з унукамі ды ўнучкамі чародкай ішлі ў дзіцячую. Таму завітаць вырашылі ў дарослую: маўляў, а як з чытачамі тут? Няблага. Пераканаліся па справаздачнасці, што за дзень у ліпені тут бывае ў сярэднім па 20-30 чытачоў. Для

На людным месцы

“Гуды” аказаліся нечаканымі

18 ліпеня ў маёнтку “Каробчыцы” пад Гроднам прайшоў заключны этап Рэспубліканскага конкурсу-фестывалю фальклору і народнай песні Беларускага таварыства інвалідаў па зроку “Фольк-фэст “Гуды”.

ГРОДЗЕНШЧЫНА

Фальклорных фестываляў улетку нямала, але “Фольк-фэст “Гуды” выбіваецца з шэрагу. Як адзначыў галоўны куратар ад Цэнтральнага праўлення БелТІЗ Міхаіл Антоненка, мэтай фестывалю з’яўляецца раскрыццё творчага патэнцыялу асобы інваліда па зроку, яго сацыяльная адаптацыя, фарміраванне матывацыі да самаразвіцця.

А паглядзець было на што! Акрамя ўласна конкурсу фальклору і народнай песні, удзельнікі фестывалю прадставілі і вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: вышыўка, разьба па дрэве, пляценне з лазы, саломкі, паперы, бісеру, вязанне…

Больш за ўсё мяне ўразілі тэатральныя калектывы “Перасмешнікі” з Гродзенскай і “Вандроўнікі” з Віцебскай вобласці. Акцёры жылі сваімі вобразамі, а іх шчырыя эмоцыі, упэўненыя рухі, яркія касцюмы, вясёлы запал акунулі гледачоў у казку тэатральных імпрэз…

І яшчэ адна рэч мяне ўразіла і прымусіла задумацца. Звычайна на конкурсах удзельнікі становяцца сапернікамі. Ніякай дапамогі, а тым больш эмацыйнай падтрымкі, адно ад аднаго яны не чакаюць. “Гуды” ў гэтым плане аказаліся поўнай нечаканасцю. Нягледзячы на тое, што былі аб’яўлены намінацыі і ў кожнай з іх за першае, другое і трэцяе месцы былі прадугледжаны грашовыя ўзнагароды, канкурсанты шчыра падтрымлівалі адно аднаго як маглі… Гэта прыемна здзівіла і яшчэ раз даказала, што не ўсё вымяраецца грашыма.

Дарэчы, прафінансавалі фестываль члены БелТІЗ самі: грошай хапіла і на аплату ўваходных білетаў у маёнтак “Каробчыцы” для ўсіх удзельнікаў (а іх было больш за 200!), і на ўзнагароды пераможцам, і на прэміі для астатніх удзельнікаў, і на абед з вячэрай...

Настасся КОМЛІК-ЯМАЦІНА,
вядучы метадыст па фальклоры Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці
Фота аўтара

Адбыўся VI Раённы агляд-конкурс абрадавага фальклору “Спадчына зямлі Маларыцкай”. Мерапрыемства прайшло на падмостках Лукаўскага СДК.

МАЛАРЫТЧЫНА

— Раённы агляд-конкурс абрадавага фальклору праводзіцца раз на два гады, — распавядае начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маларыцкага райвыканкама Андрэй Гарбацэвіч. — Кожны раз ён мае сваю тэматычную скіраванасць. Напрыклад, у 2012 годзе самадзейныя артысты дэманстравалі фрагменты вясельнага абраду. Цяпер жа ўвазе журы і гледачоў прапаноўваліся адноўленыя фрагменты купальскіх абрадаў некаторых населеных пунктаў Маларытчыны.

Пад час агляду-конкурсу былі праведзены майстар-класы. Іх давалі Святлана Луцык (бісерапляценне), Ала Назарук (саломкапляценне), Сцепаніда Сцепанюк (выраб ільняных нітак з кудзелі на калаўроце) з раённага Цэнтра народнай творчасці, а таксама Галіна Бінясюк (вышыўка), Вольга Смаль (пляценне пояса на дошчачках), Наталля Кавальчук (пучковае пляценне саломкі)

У Смаргоні 1 жніўня адбудзецца **мітынг-рэквіем** з нагоды 100-годдзя з часу пачатку Першай сусветнай вайны.

гіпермаркет

райцэнтра паказчык — больш чым неблагі. Але ж гэта толькі абанемент. А ёсць яшчэ і чытальная зала. І ў час нашай камандзіроўкі да апоўдня ва ўстанове паспеў пабываць ці не з дзясятак аматараў кнігі. Прываблліваюць іх, натуральна, не толькі шматабяцальныя вокладкі, але і шыкоўныя інтэр'еры, шматлікія пакоі.

Загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Райбібліятэкі імя Паўлюка Труса Святлана Нясцюк пераконвае, што ў графіку ліпеньскіх мерапрыемстваў проста месца не стае. Нам, да прыкладу, спадабаўся вось які праект, што рэалізуецца ў маштабе раёна. З дапамогай райгазеты цягам пэўнага часу ладзіцца літаратурная віктарына. Потым лепшыя яе ўдзельнікі збіраюцца ў "Літаратурнай гасцёўні" бібліятэкі. Сюды ж прыязджаюць знаныя пісьменнікі. Словам, узнагароджанне пераможцаў адбываецца ў святочнай абстаноўцы, якая застаецца ў памяці. Камп'ютарнай і "кнігавыдавецкай" тэхнікі ў бібліятэцы хапае. Няўжо ўсе бюджэтныя грошы пайшлі на ўзвядзенне і абсталяванне галоўнай установы раёна?..

Калі скіроўваліся на раён, заўважылі, што побач з Палацам культуры завяршаецца аддзелка гіпермаркета. Падумалі: расце ды багацее раённы цэнтр…

Алег Каламіец (на пярэднім плане справа) у выставачнай зале Палаца.

Святлана Нясцюк паказвае выданні раённай бібліятэкі.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Даўно пераканаўся, што плённае супрацоўніцтва бібліятэк і мясцовых краязнаўцаў ідзе на карысць усім бакам, але найперш — чытачам. Вось і ў галоўнай уздзенскай бібліятэцы заўважыў дыскі штомесячнага мультымедыйнага часопіса "Вытокі Уздзеншчыны", над якім працуе краязнаўца Васіль Лычкоўскі. Энтузіяст не толькі выпускае цікавы інфапрадукт, але яшчэ і працуе над аднайменным інтэрнэт-парталам, дзе можна адшукаць пазнаваўчыя дакументальныя стужкі, прысвечаныя Уздзеншчыне, запісы народных спеваў, фотаздымкі адметных мясцін раёна. Хочацца спадзявацца, што і ў іншых раёнах такіх энтузіястаў з кожным годам будзе з'яўляцца ўсё больш.

Кухцічы сумуюць

А вось у вёсцы **Кухцічы** (420 жыхароў), як мы пераканаліся, працэсы не такія аптымістычныя. Кіраўнік мясцовага СДК Ірына Ярмак адпрацоўвае кантрактны тэрмін і ўладкоўваецца… прадаўцом ва ўздзенскі гіпермаркет. Месца ўжо "забіла". Кажа: "Хоць пажыву палюдску". Дык мо яна — не прафесіянал? Ды не. Сямнаццаць гадоў — на адным працоўным месцы. За плячыма — Магілёўскае мастацкае вучылішча. Мы правялі апытанне — Ірыну Анатольеўну ў Кухцічах ведае кожны другі, не лічачы кожнага першага. Дык што здарылася? А вось гэта пытанне з пытанняў. Паспрабуем на яго адказаць, як кажуць, разгорнута.

Спачатку — пра тое, што было. А былі акампаніятар (са сваёй апаратурай і баянам) ды мастацкі кіраўнік (прыязджалі з Уздзенскай ДШМ і працавалі ў Кухцічах на паўстаўкі), сем гурткоў, шматлюдныя дыскатэкі. Летась, па словах Ярмак, клубнікі рабілі ўлетку падворны (!) абыход жыхароў з баянам. Уявіце сабе гэтую карцінку: клуб прыходзіць да вас у госці, віншуе з днём народзінаў, спявае, танчыць і зычыць дабрабыту! Пагадзіцеся, ад усяго гэтага толькі каменнае сэрца не здрыганецца ад радасці. Таму і быў СДК — рабочым. Інакш кажучы, кожная структура яго працавала з максімальнай аддачай, так, як і вучылі колісь — педагогі культасветвучылішча ды ўласнае сумленне творцы…

А зараз — пра тое, што ёсць. Дакладней, пра тое, што засталося. У выніку скарачэнняў знік не толькі акампаніятар, а і баян ды якасная музычная апаратура, што належыла настаўніку. Моладзь была імгненна згублена… Сапраўды, якія танцы пад кепскі музычны цэнтр ды састарэлую да немагчымасці светлаканаўскую апаратуру? На нуль былі зведзены і святочныя падворныя канцэрт-туры. Замест сямі гурткоў засталося тры. Але самае галоўнае — скончылася цярпенне ў клубнага кіраўніка (у нас яно, на жаль, не вечнае). Адрамантаваны, дагледжаны СДК, які яшчэ год таму быў жывы, змушаны сканаць на сум кожнага з 420 вясковых жыхароў. Ці ж па-гаспадарску гэта? Не, мы верым, што і ў гіпермаркеце Ірына Анатольеўна знойдзе сябе (прычым зусім за іншыя грошы): таленавіты чалавек ва ўсім — таленавіты. Мо і камерныя імправізаваныя канцэрты для пакупнікоў будзе ладзіць? Але адназначна іншае: замену прафесіяналу знайсці цяпер амаль немагчыма і Кухцічы асуджаны сумнай цішынёй на невядомы тэрмін…

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Мы раскідваемся золатам. Ці варта забывацца на тое, што ў галіне культуры кадры — своеасаблівыя, часам — незаменныя? Да прыкладу, той жа клубнік працаваць у краме — зможа. У яго хопіць артыстызму ды імправізацыйнага майстэрства, каб знайсці ключык да душы любога пакупніка, а падлічыць рэшту — не самая галоўная праблема. Праблема, калі клубнай творчасцю зоймецца крамніца, якая здолее хіба што толькі мізэрны прыбытак ад нецікавай дыскатэкі падсумаваць. Работнікі гандлю, не крыўдуйце! Але я не памятаю, калі мне апошнім часам прыязна ўсміхаліся з-за касы… Відаць, у вас таксама кадравыя праблемы. А вось як цудоўна ўсміхаюцца культработніцы-жанчыны, бачу ці не штотыднёва, тым і натхняюся… Калі ж я памыляюся, папраўце аргументавана, і мы разам паспрабуем глыбакадумна паразважаць пра важкі ўклад жывёлаводаў, прадаўцоў і работнікаў нашай слаўнай адукацыі ў мэтанакіраванае развіццё сельскай культуры Беларусі.

Будны і Завішы

Зробім перадышку. І сабе, і чытачам. Уздзеншчына падарыла нам і шмат шчаслівых хвілін. Шчасце гэтае звязана са знаёмствам пашанотных руін, што засталіся ад колісь велічных маёнткаў, і сядзіб выбітных гістарычных асоб, якія разумелі ролю культуры ды мастацтва ў развіцці "паспалітага" грамадства. Яшчэ пры падрыхтоўцы да аўтатура вырашылі пазнаёміцца са спадчынай роду Завішаў, таму, па шчырасці, і скіраваліся ў Кухцічы...

А пра гэта — наступным разам.

Агульнае (не)лірычнае адступленне

Яно не будзе доўгім. Спрактыкаваныя кадры трэба пеставаць і захоўваць з гаспадарлівасцю. І ўзрост тут, як падаецца, не пры чым. Калі збуёдаем ядро бібліятэкараў і клубнікаў, што маюць не проста працоўны стаж, а неацэнны досвед, дык хто будзе ставіць на крыло тых маладзёнаў, што толькі прыйшлі ў клубы і бібліятэкі пасля каледжаў ды ВНУ і яшчэ жыцця не бачылі? Прафесіяналы, беражыце сябе!..

Фота аўтараў

Працяг матэрыялаў аўтатура пра культуру Уздзеншчыны і Салігоршчыны **чытайце ў наступных нумарах газеты.**

Моманты агляду-конкурсу ў Лукаве.

Грачанік з рыцкім смакам

са школы народнай творчасці Хаціслаўскага СДК і Іван Кардзялюк (лозапляценне) з Ужоўскага дома фальклору.

Адметнасцю сёлетняга мерапрыемства стала выстаўка-конкурс выпечанага хлеба з грэцкай мукі "Рыцкі смак". Жанчыны-пекары, згодна з умовамі, дэманстравалі не толькі грачанік, але і рэцэпт яго прыгатавання. У спаборніцтве прынялі ўдзел прадстаўнікі больш як дзесяці населеных пунктаў Маларытчыны.

— Агляд-конкурс меў на мэце паказаць аднаўленне, зберажэнне і пераемнасць мясцовай традыцыйнай культуры, — распавядае дырэктар ЦКС Наталля Галавій. — Мы пераканаены, што падзея паспрыяе далейшаму фарміраванню ў моладзі сапраўднага разумення каштоўнасці і адпаведнага стаўлення да асноў рэгіянальнай культуры як сацыяльна значнага фактара жыцця…

Здаўна летняя ночка купальская авеяна таямнічасцю і загадкавасцю. Купаллю народ прысвяціў мноства розных легенд, паданняў, песень… Усё гэтае багацце паказалі на сцэне фальклорныя гурты з Пажэжынскага СДК (II месца па рашэнні журы), Ужоўскага ДФ (III месца), Ляхавецкага, Дарапеевіцкага, Макранскага, Лукаўскага (III месца), Вялікарыцкага (I месца) і Ланскога СДК... Лепшыя грачанікі атрымаліся ў Еўдакіі Герасімук (в. Грушка) і Надзеі Дардзюк (в. Высокае). Жанчыны за свае выпечаныя вырабы атрымалі I месцы. II-е — прысуджана Алене Міцук (в. Лукава), III-е — Наталлі Еўтуховіч (в. Збураж).

Скончыўся агляд-конкурс этнадыскатэкай, якую правёў Дзіцячы клуб аматараў фальклору "Вясковая табала".

Мікалай НАВУМЧЫК
Фота аўтара

ф о т а ф а к т

Ад Свяцка да Нямнова

Журналісты "К" выправіліся ў чарговы велатур. Гэтым разам — па Гродзеншчыне.

На здымках: Палацава-паркавы комплекс у в. Свяцк (зверху); форт-крэпасць часоў Першай сусветнай вайны ў наваколлях Гродна. / Фота Ільі СВІРЫНА

З 24 па 27 ліпеня на стыку межаў Беларусі, Латвіі і Расіі дзейнічае XXIII Міжнародны маладзёжны лагер **"Бе-La-Русь"**.

Стратэгія начальніка аддзела

Майстэрня пры гаспадарчай групе

Кармяншчына — не самы заможны раён Гомельшчыны, пацярпелай ад чарнобыльскай навалы. Гэта і дыктуе стратэгію дзейнасці мясцовага аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. І названая стратэгія — не выжывання, а досыць упэўненага развіцця рэгіянальнай культуры. Так што і багацейшым у фінансавым плане аддзелам ёсць чаму павучыцца ў работнікаў культуры Кармянскага раёна.

ТЭКСТ

Святлана КАЗЛОВА,
Кармянскі райвыканкам

Усё правільна. Раён датуецца вобласцю толькі на 92 працэнты. Гэта самае асноўнае, на мой погляд, сённяшняе пытанне. Вось і імкнёмся яго вырашаць як мага лепш, бо чакаць бюджэтных грошай — клопат невыносны. Словам, зарабляем і справу гэтую трымаем на самым пільным кантролі.

Лічу пэўным камерцыйным дасягненнем, што сёлета пры нашай гаспадарчай групе створана сталярная майстэрня, якая вырабляе рэчы на продаж. Прычым працэс заснаваны на выкарыстанні матэрыялу другога гатунку, які звычайна спісваецца ў адходы. За кошт рэалізацыі дзяржальняў для грабель, рыдлёвак і віл, раздзелачных дошак, рассадных скрыняў мы за паўгоддзе паклалі ў аддзелаўскую скарбонку каля двух мільёнаў рублёў. Не многа, але і не мала… Так што не толькі канцэрты ды шоу-праграмы дапамагаюць нам зарабіць сродкі на ўмацаванне нашай тэхнічнай базы.

Гадавы план па аказанні платных паслуг — 357 мільёнаў рублёў. Факт па выніках паўгоддзя — больш за 200 мільёнаў. Хоць і вялікае заданне, але ёсць усе падставы сцвярджаць, што сёлета мы з ім паспяхова справімся. Напэўна, і ў іншых раёнах зразумелі, што канцэрты ды дыскатэкі не надта дапамагаюць цяпер зрабіць пазабюджэтную дзейнасць аддзелаў сапраўды выніковай. Мы, да прыкладу, за набытыя ўласнымі сіламі грошы закупілі батуты, электрамабілі, атракцыёны… Кожны тыдзень у нас дзейнічае Клуб выхаднога дня, насычаны мерапрыемствамі для паўнацэннага сямейнага адпачынку. Так што названыя культурныя паслугі — вельмі запатрабаваныя як у горадзе, так і ў аграгарадках.

Ці кожнай установе трэба даводзіць такі план? Лічу, што кожнай. Нават дзіцячай бібліятэцы. Ксеракапіраванне і набор тэкстаў, афармленне дакументацыі — тыя паслугі, якія ніякім чынам не адбіваюцца на актыўнасці чытання падлеткаў.

Так, не ўсе ўстановы культуры спраўляюцца з планам. І прычына тут даволі простая: колькасць насельніцтва імкліва падае. Лічу, што гэты фактар абавязкова трэба ўлічваць пры планаванні пазабюджэтнай дзейнасці сярод сельскіх клубаў і бібліятэк. Што і казаць, нават у раённым цэнтры дадзеная праблема — вельмі адчувальная. Закрываюцца паштовыя аддзяленні, на прадпрыемствах скарачаецца колькасць рабочых і служачых.

Сёлета пры нашай гаспадарчай групе **створана сталярная майстэрня, якая вырабляе рэчы на продаж**. Прычым працэс заснаваны на выкарыстанні матэрыялу другога гатунку, які звычайна спісваецца ў адходы. За кошт рэалізацыі дзяржальняў для грабель, рыдлёвак і віл, раздзелачных дошак, рассадных скрыняў мы за паўгоддзе паклалі ў аддзелаўскую скарбонку каля двух мільёнаў рублёў.

У сувязі з гэтым хачу зазначыць, што вобласць нам вельмі істотна дапамагае. Была ў нас, да прыкладу, вялікая праблема з набыццём музычных інструментаў для ДШМ. Не абнаўляліся яны, напэўна, каля дваццаці гадоў. Абласное ўпраўленне сёлета выдаткавала нам 180 мільёнаў рублёў для вырашэння набалелага "музычнага" пытання. Такая ж сума прыйшла з Гомеля і на "агучку" Кармы: на набыццё музычнай і гукаўзмацняльнай апаратуры для правядзення гарадскіх культурна-масавых мерапрыемстваў...

Даволі ўдала прадаецца сувенірная прадукцыя нашых майстроў-рамеснікаў. Яны выязджаюць у санаторый "Прыдняпроўскі" разам з нашымі спевакамі і танцорамі. Вяртаюцца заўжды задаволенымі. Сапраўды, і грашовы прыбытак — заўжды гарантаваны, і прапаганда нашага майстэрства сярод замежных гасцей — вельмі дзейсная.

Мы распрацавалі канцэпцыю дзейнасці "Бычанскай альтанкі". У вёсцы Акцяброва на базе невыкарыстоўваемага будынка дзіцячага садка мы збіраемся стварыць аграсядзібу пад згаданай назвай (Акцяброва калісьці называлася "Быч"). Так, праект патрабуе значных укладанняў. Але ў перспектыве можа атрымацца шыкоўная ўстанова культуры, дзе і канцэрты можна паказваць, і з традыцыйнай беларускай кухняй гасцей знаёміць…

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77,
альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby,
twitter.com/kimpressby
odnoklassniki.ru/group/52156879339702

Пра падзею — постфактум

У рэдакцыю "К" прыйшоў ліст ад кіраўніцтва ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага гарвыканкама, дзе выказана просьба апублікаваць на старонках нашай газеты водгукі і словы ўдзячнасці ад удзельнікаў нядаўняга Міжнароднага фестывалю народнай творчасці "Вянок дружбы". Мы пагадзіліся і друкуем вытрымкі з дадзенага эмацыйнага ліставання, якія, як нам падаецца, хоць і крыху, але раскрываюць "тэхналагічны" змест мерапрыемства, цікавы метадыстам, сцэнарыстам і рэжысёрам масавых акцый з іншых раёнаў ды абласцей Беларусі. Нагадаем толькі, што сёлета ў фестывалі бралі ўдзел 25 творчых калектываў з 18 краін чатырох кантынентаў, сярод якіх — Гана, Швецыя, Нідэрланды, Іспанія, Боснія і Герцагавіна, Сербія, Румынія ды іншыя.

Яўген РАГІН

"Вянок…" і ягоны розгалас

Аднан КАРАЦА,
Турцыя:

— З 1971 года мы наведалі шмат фэстаў па ўсім свеце. "Вянок дружбы" — адзін з лепшых!..

Боба ВРАНЕЦ,
прэзідэнт Студэнцкага культурнага цэнтра, Сербія:

— Такое прадстаўнічае мерапрыемства, дэвізам якога з'яўляецца ўсеагульнае сяброўства, мяне вельмі ўразіла. І гэта прытым, што я больш за 35 гадоў займаюся фальклорам. Пражыванне, харчаванне, умовы для выступлення нашага ансамбля — проста выключныя!..

Людміла ДЗЁМІНА,
старшыня Праўлення мясцовай грамадскай арганізацыі "Беларуская нацыянальна-культурная аўтаномія "Нёман" гарадской акругі Тальяці,
Сяргей ШЫЛКІН,
намеснік старшыні Праўлення па рабоце з моладдзю і сувязях са СМІ:

— Усё было дакладна арганізавана, кожны без мітусні займаўся сваёй справай. Гэта высокі прафесіяналізм. Тое ж тычыцца і працы куратараў, а таксама — галоўнага рэжысёра "Вянка дружбы" Клаўдзіі Лукашэвіч. З замежнымі дэлегацыямі працавалі дасведчаныя перакладчыкі…

Ларыса ШЫЛІНА,
мастацкі кіраўнік шоу-тэатра "Алевай" з Ашдода, Ізраіль:

— Наша здзіўленне пачалося з афармлення беларускіх віз. Па хадайніцтве кіраўніцтва Бабруйска і фестывальнага аргкамітэта візы зрабілі ў найкарацейшыя тэрміны, а для дзяцей — бясплатна.

Нам падаліся вельмі якаснымі інтэрнэт-кансультацыі, што праводзіла для нас рэжысёрская група. Стала зразумела: мы едзем на мерапрыемства сусветнага ўзроўню. І сапраўды, фестывальныя дні прайшлі без напружання ды стомы. За намі быў замацаваны аўтобус. Пражыванне аказалася камфортным, а ежа — вельмі смачнай. Праграма фэсту — прадумана да драбніц. Вольны ж час — насычаны і цікавы. Да прыкладу, мы наведалі гарадскую яўрэйскую суполку. Словам, такога нідзе не бачылі, хоць і прэзентуем свае пастаноўкі па свеце ўжо дзевяць гадоў. Вы даяце прыклад іншым краінам, як сябраваць, тварыць і не ваяваць адно з адным…

Абрахам ПАДЗІ, Гана:

— Пасля вяртання на радзіму мы наведалі нашы міністэрствы культуры і замежных спраў, расказалі аб вашым фестывалі, паказалі відэа. Рэакцыя была надзвычай станоўчай. Вырашана, што наша дэлегацыя павінна наведаць Бабруйск з праграмай, якая распавядае пра нашу культуру і гісторыю…

Уладзімір КРАЧКОЎСКІ,
кіраўнік Сербскага культурна-мастацкага таварыства "Доктар Младэн Стаяновіч", Боснія і Герцагавіна:

— Для пачатку нашага супрацоўніцтва высылаю дакументы нашага Міжнароднага фестывалю хароў. У вас ёсць цудоўны хор. Чакаем яго на нашым фэсце!..

К

Рэзюмэ ад Я.Р. у працяг тэмы

Такая форма прэзентацыі фэсту ў фармаце "постфактум" падалася нам сімпатычнай. Натуральна, у большасці водгукаў на "Вянок дружбы", што прыйшлі ў Бабруйск, пераважае не аналіз мерапрыемства, а станоўчыя эмоцыі, выкліканыя апошнім. І гэта натуральна, бо добры настрой — заканамерны вынік любой высакаякаснай акцыі. Але падумалася пра іншае…

Ці патрэбны нам фестывальныя крытыкі?

У летні час бадай кожны супрацоўнік "К" прысутнічае на тым ці іншым фестывалі ў самых розных кутках Беларусі. І літаральна кожны з нас можа прывесці прыклады з асабістай практыкі, калі на крытыку, скажам, рэжысуры адкрыцця ці закрыцця форуму, якая падалася "спісанай" з пастановачных "вынаходніцтваў" зусім іншага фэсту ў зусім іншым рэгіёне, аргкамітэт рэагаваў больш чым хваравіта. І яго, на першы погляд, можна зразумець. Маўляў, якая можа быць крытыка, калі такі замежны розгалас! Маўляў, фестываль — цудоўны і бездакорны ва ўсіх яго праявах!

Але цяпер давайце падумаем: ці ідзе на карысць агульнай справе развіцця фестывальнага руху адсутнасць сур'ёзнага аналізу (чытай — крытыкі) любой нашай масавай акцыі? Не сакрэт жа для сапраўдных прафесіяналаў, што ў краіне існуе пэўны сцэнарны крызіс. І не проста існуе, але з кожным годам пашыраецца. Пра гэта нам адкрыта кажуць метадысты з раёнаў і абласцей. А слабы сцэнарый не выратуе самая віртуозная рэжысура. Вось і атрымліваецца: калі прысутнічаць запар на некалькіх фестывалях, усе яны зліваюцца ў даволі аднастайную, даруйце, дзею (на адкрыцці — барабаншчыцы, на закрыцці — феерверк), страчваючы мясцовы каларыт ды нівелюючы намаганні папраўдзе таленавітых самадзейных артыстаў. Дзе ж выйсце?

У агульных мазгавых штурмах фестывальных творцаў, вынесеных на суд грамадства (у тым ліку і журналістаў). Але скажыце, дзе вы чулі пра крытычны постфестывальны аналіз (нават калі падзея сабрала самыя станоўчыя і шырокія водгукі гледачоў), зроблены самімі фестывальнымі аўтарамі? Калі і адбываецца "разбор палётаў", дык кулуарна, пры закрытых дзвярах, каб, не дай бог, не вынесці смецця з дома. Між тым, дом для кожнага з нас — уся Беларусь. І чаму фестывальшчык (сцэнарыст ды рэжысёр) з адной вобласці не можа павучыцца на прыкрых памылках ці прарыўных перамогах свайго альбо калегі з вобласці іншай? Самай прыдатнай трыбунай для гэтага мы лічым старонкі "К" — галіновага выдання, якое застаецца галоўным (мы вельмі на гэта спадзяёмся) для работнікаў культуры і мастацтва.

Пагаджуся, журналістам не варта выступаць у незайздроснай ды няўдзячнай ролі фестывальнага крытыка (аналітыка). Але пагаджуся толькі ў тым выпадку, калі такімі аналітыкамі (крытыкамі) выступяць самі арганізатары фэстаў. Пакажуць усім нам хібы сцэнарыя ды рэжысуры, правядуць канструктыўную работу над памылкамі, якая стане карысным метадычным набыткам і асновай для далейшай індывідуальнай творчасці літаральна кожнага спецыяліста абл- і райметадцэнтраў, кожнага фестывальнага дырэктара. Мо тады выраз "А што? У нас — як і ва ўсіх!" урэшце перастане быць агульнаўжывальным? Як вы думаеце?..

К

Ізраільская выстаўка **"Хаім Нахман Бялік: шлях паэта"** з 29 ліпеня — у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы.

Ганарар — скарга ад "суперлатошніцы"

Не заўважыць змены апошняга часу ў фанасферы сталіцы — складана. "Штосьці адбываецца ў горадзе!" — віруюць інтэрнэт-форумы. "І такі Мінск нам падабаецца!" — кажуць мінчане, узнагароджваючы таленавітых вулічных музыкантаў, што ператвараюць поліс у поўны мелодый горад… Запрасілі і мы ў рэдакцыю "К" сімпатычны street-бэнд пасля яго выступлення на адной з пляцовак. Варта адзначыць, што каманда з трох чалавек — Мікалай ДЗЕМІДОВІЧ (гітара), Аляксей ЗАХАРАЎ (кантрабас) і Антон БАГДАНАЎ (гітара) — аказалася, так бы мовіць, джэм-сэйшн-гуртом: беларусы Мікалай і Аляксей родам з Салігорска пазнаёміліся з Антонам з Масквы ў дзень выступлення.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Фота Юрыя ІВАНОВА

Якое святло запаліцца для вулічных музыкантаў?

Вулічныя, ды не зусім

Мікалай: — Мы з Аляксеем практыкуем іграць на вуліцы больш за год. Звычайна з намі яшчэ выступае наш сябра, баяніст Аляксей, але яго сёння не было. Для нас гэта ўжо звыклая практыка, хоць кожны мае пэўную музычную адукацыю. Мы з Аляксеем-кантрабасістам скончылі Дзіцячую школу мастацтваў у Салігорску, гралі ў аркестры пад кіраўніцтвам Леаніда Карташова, нашага слыннага педагога… Потым Аляксей вучыўся ў Смаленскім музычным вучылішчы, а я — у Лідзе, у тамтэйшай музычнай установе. Далей я паступіў у кансерваторыю, але кінуў… Неяк не прываблівалі мяне памеры заробкаў прафесійных музыкантаў. Сёння жыву ў Мінску, працую поварам. А граю на вуліцах горада (і не толькі) таму, што гэта істотны бонус да асноўнага заробку ды проста задавальненне!..

Аляксей: — Я ж шукаю працу.

Антон: — Мой стаж — ужо гадоў дзевяць. Спрабаваў працаваць на "нармальных работах", але ўсё заканчвалася расчараваннем. Спецыяльнай музычнай адукацыі ў мяне няма. Самавук. Займаўся з выкладчыкам па гітары, потым — у джазавай студыі два гады. Сёння сам пішу музыку. Словам, усё ж такі ўзровень не дзесяцігадовага музыканта. У Мінск трапіў па выпадковасці, шчыра кажучы: з сябрам былі ў Гомелі, у Магілёве — ну і як тут не заехаць у сталіцу?..

"Змяняем дыслакацыю"

Мікалай: — Шчыра кажучы, у час Чэмпіянату свету па хакеі быў у Кіргізіі, ездзіў аўтастопам. Пачалася летняя пара, чаму б не павандраваць? Але каб ведаў, што такое стаўленне будзе да вулічных музыкантаў пад час Чэмпіянату, магчыма, застаўся б. Можна сказаць так: усё залежыць ад чалавека. Часам міліцыянер падыдзе і ветліва звернецца, каб спыніліся. Нават такое: разгоніць усіх, хто курыць, п'е, а нас — не зачэпіць. "Вы — добра граеце, навошта мне вас ганяць?" — кажа. А бывае і так, што нейкі прадстаўнік правапарадку пачне абражаць, бо, бачна, што ў яго дрэнны настрой…

Вядома, калі мы выступаем у пераходах метро — гэта парушэнне закону. Метрапалітэн — зона павышанай небяспекі, але ж адмысловых месцаў для музыкантаў у нас няма. Таму нават калі граеш дзесьці на адкрытым паветры і, здаецца, не з'яўляешся пагрозай для стварэння таўкатні, усё роўна могуць падысці і папрасіць "праехаць". Патрымаюць, а потым адпусцяць. Усё звычайна заканчваецца нармальна, ды час марнуецца… Але мы ўжо "цёртыя калачы", таму аддаём перавагу таму, каб не ісці на канфлікт. Калі просяць не граць, проста змяняем дыслакацыю.

Аляксей: — Калі выступаем дзесьці на вуліцы, нас могуць папракнуць у незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. Ці такая распаўсюджаная рэч, як скаргі. Міліцыянер падыходзіць, кажа: "На вас паступіла скарга ад жыхароў бліжэйшага дома: вы парушаеце грамадскі парадак", — і просіць спыніцца. Дарэчы, калі граем у пераходах, то больш за ўсё на нас скардзяцца "суперлатошніцы": адбіваем пакупнікоў (*смяецца*).

Антон: — Выступаць у маскоўскім метрапалітэне — таксама забараняецца. Але ёсць звычайныя падземныя пераходы… Ці пешаходныя вуліцы: Арбат, Вялікая Дзмітраўка, Кузнецкі Мост, Нікольская… Тыя ж Чыстыя Пруды — там можна сустрэць шмат музыкантаў. Парк Горкага адкрыты для падобных выступленняў. *(Сёлета адкрытай пляцоўкай у Маскве для музыкаў стаў парк "Музеон", дзе кожны чацвер на Крымскай набярэжнай ладзіцца Дзень жывой музыкі пад адкрытым небам. — **Д.А.**)*. Словам, можна знайсці месца, дзе здолеем пачуваць сябе больш-менш небяспечна. Але, шчыра кажучы, я выбіраю не людныя пляцоўкі, хоць яны і лічацца больш "рыбнымі": там, дзе натоўп, мне граць не вельмі камфортна.

Мікалай: — Так, мы заўважылі, што ў Маскве сітуацыя лепшая. У нас жа нават ніводнай пешаходнай вуліцы няма. Была Карла Маркса, дзе на адным адрэзку дзясяткі музыкантаў ляпіліся, — і тая знікла…

Бізнес з асаблівасцямі

Антон: — Звычайна я з сабой прыношу комбік і граю прыкладна дзве-тры гадзіны. За адзін раз атрымліваецца зарабіць прыкладна тысячу расійскіх рублёў. Калі ж паставіцца сур'ёзна, то, мяркую, можна зарабіць і больш.

Аляксей: — У нас у Мінску, калі граць рэгулярна, можна выйсці на тры мільёны ў месяц…

Мікалай: — Каб не трэба было здымаць кватэру, можна было б жыць за кошт гэтых заробкаў: на ежу і мінімальныя забавы хапае. Але гэта бізнес са сваімі асаблівасцямі. Часам можна выступаць цэлы дзень — і нічога не атрымаць, а бывае — за тры гадзіны ўдаецца сабраць месячную "выручку"… Часам нават і не ўгадаеш. Але, па-першае, трэба не надакучваць людзям. Там пайгралі, тут, яшчэ недзе, — каб быў такі момант прыемнай нечаканасці, а не звычкі. Па-другое, людзі ахвотна ўзнагароджваюць, калі ў іх ёсць грошы. Таму залатыя дні — гэта 5-га і 25-га, калі народ атрымлівае зарплату. Яшчэ сваю ролю адыгрывае суседства кірмашоў, гандлёвых кропак. І па-трэцяе, ці нават па-першае, — рэпертуар. Ён у нас увесь час папаўняецца новымі песнямі. Да ўсяго, імкнёмся прыўнесці ў хіт нешта арыгінальнае…

Аляксей: — Мы выконваем вядомыя песні ў гэткай нечаканай аранжыроўцы. Напрыклад, "Забери меня скорей" гурта "Руки вверх" у такім інструментальным складзе: кантрабас, гітара, баян. "Ветер с моря дул" — у прыфанкаванай варыяцыі. Гучаць хіты на розных мовах — нашых гуртоў, украінскіх выканаўцаў... Рок у нас таксама ў фаворы.

Мікалай: — Глядзім, рабочыя з Трактарнага завода дадому ідуць — выконваем тое, што ім бліжэй: таго ж Лепса. Бачым, моладзь з дрэдамі шпацыруе — мы давай рэгі! Зразумела, што да кожнай аўдыторыі — свой падыход…

Мікалай: — Таксама выконваем уласныя творы, але рэдка. Марым неяк узяцца і запісаць тое, што насачынялі.

Антон: — Дома я выконваю пераважна інструментальную музыку. Але ў падарожжы апаратуру з сабой не пацягнеш, таму даводзіцца спяваць. Люблю панк-рок, індзі-рок, сінці-поп... Вядома, тое, чым я зараз займаюся — гэта не мяжа мараў. Хочацца ў будучым сабраць свой гурт і паспрабаваць узняцца на новы ўзровень. Але для гэтага трэба прапанаваць адметны музычны прадукт: знайсці нешта цікавае ў музычным плане. Падаецца, у такім варыянце штосьці мо і атрымацца.

"Вуліца — гэта індыкатар"

Мікалай: — Насамрэч, я іграў шмат дзе за час вучобы ў кансерваторыі (дый не толькі), але такой свабоды, як у вулічным фармаце, не адчуваў нідзе. Гэта непасрэдны кантакт са слухачом. Чалавек, магчыма, і не планаваў спыняцца, але ты яго неяк зацягнуў, прывабіў, — і ён стаіць ды спявае разам з табой! Вуліца — гэта такі індыкатар, які паказвае, чаго ты варты як музыкант, чаго вартыя твае песні…

Аляксей: — Іншая справа, што ў нас узровень вулічных музыкантаў вельмі нізкі. Кажу гэта як чалавек, які мае музычную адукацыю і які там-сям папаездзіў. Часам ідзеш і бачыш, што музыка ведае два-тры акорды… У той жа Маскве — значна цікавейшыя выканаўцы. А што вырабляюць музыканты ў Італіі, Францыі… Чуў, нібыта магчымасць выступіць на Елісейскіх палях даецца далёка не кожнаму выканаўцу: гэта мусіць быць адметны і нешараговы музыкант…

Мікалай: — Яшчэ ўзровень так званых аскераў — гэтыя тыя людзі, якія звяртаюцца да мінакоў з просьбай "узнагародзіць музыканта". Гэта ж сапраўднае мастацтва — прыгожа прасіць, аднак у нас дзеянні аскераў часам нагадваюць п'янае вымагальніцтва… Няма культуры вулічных выступленняў. Яна ўзнікне тады, калі музыкантам будзе дзе выступаць і паміж імі з'явіцца канкурэнцыя. Слухач ужо падумае, ці заплаціць таму, хто і спяваць не ўмее, альбо скрыпічнаму трыа, што бездакорна выконвае Моцарта. Альбо ўзнагародзіць самародка, які грае на трох інструментах…

У Мінску да гэтай пары няма пешаходных зон. А мы, зыходзячы з уласнай практыкі, бачым, што людзям падабаецца, калі ў горадзе нешта адбываецца. Тут грае джазавы бэнд, там прадаюць смачныя круасаны, трошкі далей — хтосьці малюе карціны, а хтосьці — прадае сувеніры… А яшчэ праз тры крокі — гучыць саксафон.

Аляксей: — Я згодны з Мікалаем, але хачу дадаць, што Мінск усё ж патроху змяняецца. І гэта заўважна. Аднак хацелася б, каб і ў малых гарадах нешта зрушылася з мёртвай кропкі. Бо ўспомніш родны Салігорск — і сумна становіцца: проста штыль у вулічным жыцці…

Мікалай: — Дзіўна, але ўладам павінна быць выгадна, калі горад сам робіць гэўныя культурныя прапановы. І іх трэба падтрымліваць.

Антон: — Ведаю, што зараз расійскія ўлады спрабуюць штосьці прыдумаць для вулічных музыкантаў. Паркі сталі больш адкрытымі, ва ўсялякім выпадку, спрабуюць заахвоціць да супрацоўніцтва. Ёсць у нас і пешаходныя вуліцы, аднак тыя магчымасці, што існуюць, лічу, — толькі пачатак. Шмат пытанняў патрабуюць вырашэння. Напрыклад, тыя зоны, якія зараз адкрыліся ў летнюю пару: што з імі будзе ўзімку?..

К

Пра пазіцыю гарадскіх улад па гэтым пытанні чытайце **ў наступных нумарах "К".**

Культура пачалася з...

...сям'і, бацькоў ды ведаў

ТЭКСТ

Кася КАМОЦКАЯ, спявачка, бард:

— Чалавек, як вядома, нараджаецца ў культуры, у пэўным культурным кантэксце. Таму, зразумела, у мяне ці для мяне культура пачалася з сям'і, з маіх бацькоў. Што да беларушчыны, дык яна пачалася не з бацькоў (у нашай сям'і размаўлялі па-руску), а з ведаў. Калі я паступіла на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дык нават тады, у тыя савецкія часы, там давалі вельмі багата ведаў. Менавіта яны, а таксама тыя людзі, з якімі я разам навучалася, і далі мне магчымасць зразумець, што беларусы — гэта народ, які адрозніваецца ад іншых, што ў нас ёсць свая гісторыя, культура, мова…

Што ні кажы, а беларусы цяпер — гарадская нацыя: 75 працэнтаў жыхароў краіны жыве сёння ў гарадах. Таму народная, аўтэнтычная культура, народныя спевы, якія, як вядома, вельмі моцна знітаваны з земляробчым календаром, — усё гэта паціху знікае, паціху аджывае свой век. Народная культура, на мой погляд, хутчэй за ўсё, застанецца ў, так бы мовіць, музейным фармаце, бо паступова знікае тая глеба, з якой яна жывілася, — жывыя носьбіты традыцый, знаўцы народных абрадаў, песень...

Цяпер, у часы глабалізацыі, кожны народ, кожная нацыя шукае тое, што адрозніваецца ад іншых, вылучае з масы. Таму многія звяртаюцца **да сваіх каранёў, да таго, чым яны ўнікальныя**. І беларусы ў гэтым плане — не выключэнне…

Хаця не магу не адзначыць, што за апошнія гады народная, аўтэнтычная культура робіцца ўсё больш і больш папулярнай, у тым ліку — і сярод моладзі. Напрыклад, за савецкім часам народныя спевы існавалі ў форме "лубка" і мелі, фактычна, чыста дэкаратыўнае прызначэнне. Цяпер — зусім іншае. Усё больш і больш у краіне ладзіцца фальклорных фестываляў, якія наведваюць як айчынныя, так і замежныя турысты, шмат спевакоў ды музычных гуртоў звяртаецца да народнай песні, да беларускага фальклору…

Магчыма, гэта звязана не толькі з тым, што Беларусь атрымала незалежнасць, але і з тым, што цяпер, у часы глабалізацыі, кожны народ, кожная нацыя шукае тое, што адрозніваецца ад іншых, вылучае з масы. Таму многія звяртаюцца да сваіх каранёў, да таго, чым яны ўнікальныя, чым не падобныя да іншых. І беларусы ў гэтым плане — не выключэнне…

З 28 ліпеня на канале "Беларусь 1" да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай — хранікальна-дакуметальны цыкл **"Вялікая вайна"**.

Знак "Pruzana": 1914 — 1918

Сведкі Першай сусветнай з альбома аднаго салдата

У Музеі-сядзібе "Пружанскі палацык" — выстаўка "З нямецкага фотаальбома 1914 — 1918 гг.".

Пераважную большасць экспанатаў склалі здымкі, зробленыя нямецкімі фатографамі. Некаторыя фота паслужылі асновай для паштовак, якія адпраўляліся нямецкімі і аўстрыйскімі ваеннымі на радзіму. Асабліва шмат на іх выяў помнікаў, што і сёння з'яўляюцца ўпрыгожаннем Пружан: палацык, сабор Аляксандра Неўскага, гандлёвыя рады "Белыя лаўкі", касцёл, аптэка... Паколькі выпуск друкаванай прадукцыі быў масавым, выяўленне паштовак з відамі горада з'яўляецца найбольш частай знаходкай (хаця захавалася іх няшмат). Акрамя відавых фота, папулярнымі былі сюжэтныя: мясцовыя жыхары на старых вуліцах — Аляксандраўскай, Замкавай, Тамашоўскай, Мясніцкай, Калоніі, Могілкавай, — на гандлёвай плошчы, на мастах праз Мухавец...

Здымкі згаданага перыяду ўяўляюць даволі цікавую крыніцу для даследчыкаў, адкрываючы невядомыя раней старонкі мясцовай гісторыі. Уважліва разглядаючы фота, можна ўбачыць, што Пружаны на пачатку XX стагоддзя былі чыстым і прывабным горадам. Але з-за таго, што большасць гарадскіх вуліц была незабрукавана, у час непагадзі апошнія ператвараліся ў бездараж.

Зімой 1915 — 1916 гг. да Пружан ад станцыі "Лінова" была пракладзена вузкакалейка, якая звязала горад з чыгуначнай лініяй "Брэст — Масква". У 1916 — 1918 гг. у Пружанах з'явілася электрычнасць. Гэта пацвярджаюць не толькі ўспаміны мясцовых жыхароў, але і фотадакументы: на адным з іх можна заўважыць устаноўку слупоў і нацягванне электрадратоў у раёне "Белых лавак". Вялікае значэнне прадстаўленыя фота маюць для вызначэння даты пабудовы шэрагу гарадскіх аб'ектаў. Акрамя згаданых помнікаў, датаванне якіх устаноўлена, вынікае, што да 1915 г. у горадзе ўжо існавалі некаторыя сучасныя будынкі, а пэўныя фота даюць уяўленне пра аб'екты, якія ўжо не існуюць: Прачысценская царква (на яе месцы стаіць універмаг), драўляны храм (каля ўніверсама), ветракі (раён аўтапарку № 11), драўляная забудова ў розных частках горада… Акрамя таго, на некалькіх здымках адлюстраваны нямецкія пахаванні на каталіцкіх могілках і яўрэйскія могілкі (часткова захаваліся).

Пад час падрыхтоўкі матэрыялаў нечаканым аказаўся той факт, што шэраг дакументаў прайшоў пэўную "зачыстку" ці "дапрацоўку". Пра параўнанні здымкаў, якія на першы погляд здаваліся аднолькавымі, было заўважана, што з некаторымі працавалі рэтушоры: зацёрты фігуры (часцей нямецкіх салдат), а на іншых з'явіліся дадатковыя элементы. Трэба адзначыць, што сярод іх — фота, якія ўжо трапілі ў друкаваныя альбомы ці размешчаны ў Сеціве пад выглядам арыгіналаў. На жаль, аўтары пераважнай большасці фотаздымкаў, якія прадстаўлены на выстаўцы, застаюцца невядомымі.

Асобнае месца ў экспазіцыі займаюць 22 фатаграфіі з альбома нямецкага маёра Франца Гроса з Вюртэмбергскага пяхотнага палка ландштурма № 13. Ён у 1916 — 1917 гг. служыў у Пружанах і Пружанскім лагеры. Здымкі Гроса сталі сапраўдным адкрыццём, якое дазволіла па-новаму паглядзець на перыяд Першай сусветнай вайны, раскрыць невядомыя старонкі жыцця Пружаншчыны. Так, дзякуючы ўнікальнай знаходцы, удалося пацвердзіць, што аб'екты з назвамі "Pruzana" і "Pruzana-Lager" уяўляюць з сябе два розныя населеныя пункты: апошні знаходзіўся на адлегласці ў шэсць кіламетраў ад аднайменнага горада, на тэрыторыі сучаснай вёскі Слабудка. Раней большасць даследчыкаў фактычна атаясамлівала абедзве назвы, таму ў даведнікі ды альбомы трапіла памылка наконт іх лакалізацыі. Сапраўды, у той час гэтыя два аб'екты амаль не падзяляліся, але яны былі розныя, кожны з іх меў сваю структуру і прызначэнне.

Атрымліваецца, што фотаздымкі з пазнакай "Pruzana" не заўсёды адлюстроўваюць сучасны горад. Работы Гроса гэта яскрава пацвярджаюць. Унікальнасць яго фота ў тым, што большасць з іх не стала тыражнай прадукцыяй, іх амаль не знойдзеш на паштоўках. На здымках нямецкага маёра можна ўбачыць адлюстраванне розных бакоў жыцця Пружан: гатэль "Маскоўскі", галерэя ў "Белых лаўках", нямецкі "Ганзейскі клуб", гарадскі духавы аркестр, паштовая аўтакалона, а таксама фатаграфіі вядомых аб'ектаў горада, але з незвычайных ракурсаў.

У альбоме знаходзяцца фота з "Пружанскага лагера": вуліцы і ваенныя аб'екты, пляцы, заняткі ў кулямётнай школе... Грос адлюстраваў таксама сядзібу Чахец, дзе ў перыяд нямецкай акупацыі знаходзілася мінамётная школа, і чыгуначную станцыю "Лінова". Трэба адзначыць, што ў альбоме маёра Гроса, які носіць назву "З палескіх балот 1917 г.", знаходзяцца фота, зробленыя не толькі на Пружаншчыне, але і ў іншых мясцінах захаду Беларусі, — усяго 158 чорна-белых здымкаў выдатнай якасці. Альбом Франца Гроса выйшаў у 1917-м у Лейпцыгу (Германія) з друкарні "Доктар Грэнклер і К°". Згаданы фотаальбом стаў сёлета адным з найкаштоўнейшых набыткаў Музея-сядзібы "Пружанскі палацык".

Наталля ПРАКАПОВІЧ,
галоўны захавальнік фондаў
Музея-сядзібы
"Пружанскі палацык"

Вуліца Аляксандраўская ля сабора.

Вуліца Вільгельма ў Пружанах.

Сабор Аляксандра Неўскага. 1915 — 1917 гг.

Гандлёвая плошча ля "Белых лавак".

Вуліца Аляксандраўская. Мост.

22 лістапада ў Даласе на вуліцы Вязаў забіты Джон Кенэдзі. Кожны момант паміж двума стрэламі, што знішчылі 35-га прэзідэнта ЗША, даследавалі па адзіным дакуменце — кавалачку васьміміліметровай плёнкі, якую прадаставіў ураджэнец Украіны Абрахам Запрудэр. Камісія вывучала ўсе 26 секунд кінаматэрыялу — кожны кадрык! Падзею захаваў для гісторыі кінааматар!..

А справа ў тым, што паралельна кінаіндустрыі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя літаральна ў кожнай краіне існавала армія кінааматараў, узброеных прымітыўнымі камерамі. Чым вабіў іх нятанны і клапотны занятак? Якія яшчэ факты ўтойваюць рулоны ссохлай, пакручанай, выцвілай, знікаючай ад часу стужкі, што захоўваюць у круглых скрынях?..

Сенсацыі на 8 міліметрах

Чалавецтва ва ўсе часы імкнулася захаваць сам факт свайго існавання: у наскальных малюнках і барэльефах, у мазаіцы ды скульптуры, у жывапісе і фатаграфіі… У калядную ночь 25 снежня 1895 года фатаграфія ажыла: цягнік з белага экрана літаральна наехаў на наведвальнікаў парыжскага кафэ! Гэта браты Люм'ер паказалі чалавецтву новае мастацтва. Сваім нараджэннем кінематограф абавязаны, па сутнасці, аматарам.

І амаль адразу кіно ператварылася ў індустрыю. З'явіліся новыя прафесіі, студыі-канкурэнты. Вытворчасць патрабавала ўсё большых укладанняў, кіно стала прыносіць мільённыя прыбыткі. Здавалася б, у індустрыі няма месца самадзейнасці! Ды кінааматарства не толькі працягвала існаваць, але і, пачынаючы з 1950-х, прыцягвала ў свае шэрагі мільёны людзей з партатыўнымі камерамі. Хто яны, кінааматары?

Мінскі мастак-ілюстратар Ганна Філіпёнак сведчыць, як яе сям'я збірала грошы бацьку на касцюм. Але раптам грошы зніклі! А гэта яе тата ўпотай ад маці набыў кінакамеру "Кварц". Маці злавалася, але пасля атрымання першага ж матэрыялу — сямейнай хронікі, дзе Гануля малая, — падабрэла і ўжо не шкадавала грошай на мантажны столік ды праектар… А ванны пакой у кватэры Філіпёнкаў ператварыўся ў лабараторыю з чырвоным святлом, пяламі для сушэння плёнкі, з бачкамі і паліцамі для бутэлек з хімікатамі...

У асноўным кінааматары былі з інтэлігенцыі. Праглядаю здымкі Валерыя Лебедзева, зробленыя ў 1960-я. Звязаныя сяброўствам маладыя людзі сталі і здымачнай групай. Двое філосафаў: сам Лебедзеў і Вячаслаў Сцёпін, у будучым дырэктар Інстытута філасофіі Расійскай акадэміі навук, акадэмік; двое фізікаў: Альберт Шкляр, у будучым — спецыяліст у тэрмадынаміцы, і Леў Тамільчык, праз гады — акадэмік. Тыповы для тых часоў зрэз інтэлектуальнага грамадства: "фізікі" і "лірыкі".

Аднак здаралася, што з "забавы" нараджаліся вялікія прафесіяналы. Легендарны майстар мультыплікацыі Уолт Дысней першы фільм пра Мікі Мауса маляваў і здымаў пакадрава… у гаражы. Сакратар Свярдлоўскага гаркама камсамола арганізаваў гурток аматараў, зняў і сам першы фільмік, заўважаны крытыкай; сёння ён — класік сусветнага кіно Глеб Панфілаў. Напрыканцы 1950-х лірычная кароткаметражка "Восеньскі эцюд" удастоілася ўзнагарод на фестывалях аматарскіх фільмаў, а стварыў яе мінчанін, будучы рэжысёр Валерый Рубінчык…

Дык што за кіно, паралельнае афіцыйнаму, стваралі аматары? Якія тэмы цікавілі? Найважнейшая:

Заўтра ў філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Ракуцёўшчыне — **свята паэзіі і песні "Ракуцёўскае лета"**.

Восем міліметраў



ТЭКСТ

Уладзімір АРЛОЎ,
кінарэжысёр

Сямейная хроніка

У палескай вёсцы Папоўшчына, пасля — Акцябр, падлетак Алёша час дзяліў паміж маляваннем, чытаннем у паддашшы забароненага рамана Салжаніцына "У коле першым" і кіназдымкамі. Самы танны апарат набыў на ганарары: маляваў аднавяскоўцаў. А здымаў — што бачыў: як маці бульбу абірае, сусед грае на гармоніку, бацька з сявенькай ідзе па раллі, малодшага браціка Колю, танцы-скокі ў святы… Няма сёння ні вясёлай вёскі, ні яе жыхароў, ні бацькоўскага дома Аляксея Марачкіна — жывуць яны толькі ў зацёртых кадрах стужкі, знятай у 1950-х будучым мастаком…

Але далейшы прагляд яго карцін выявіў на экране знакавую для Беларусі постаць: Максіма Танка!.. Тут хачу згадаць: яшчэ пры жыцці Яўгена Іванавіча я збіраўся зняць пра яго фільм — і, ужо пачаўшы… адмовіўся. Танка, шматгадовага старшыню Вярхоўнага Савета БССР, шмат здымалі, але ў хроніцы то ён уручае ўзнагароду, то сустракае дэлегацыю. Адзіны бытавы кавалачак плёнкі знайшоўся на той час у кінаархіве: ён з суседам па лецішчы Аркадзем Куляшовым сядзіць у чоўне на беразе Нарачы. І ўсё. А на стужцы Марачкіна Танк — на адкрыцці выстаўкі выдатнага беларускага мастака, які жыў у Вільні і якога тут, у нас, чамусьці замоўчвалі, — Пётры Сергіевіча. Ды і іншай кінавыявы мастака, сябра Язэпа Драздовіча, нідзе не знойдзем. Дзве такія асобы ў аматарскай стужцы — гістарычны рарытэт!..

Здымка 1967 года: у вазочку — немаўлятка Радзівон, сын беларускага кампазітара, народнага артыста СССР Яўгена Глебава, а буксіруе каляску матацыкл, якім кіруе Ларыса, маці Радзівона. Пэўна, тады і ўвайшоў у хлопчыка "кінавірус", бо, калі той крыху падрос, то папрасіў у бацькоў кінакамеру, стаў здымаць — і клаліся ў сховы катушка за катушкай з сямейнай хронікай… Дакладней, лічылася яна "сямейнай", а на справе аказалася гістарычнай: у атачэнні кампазітара — Быкаў, Макаёнак, Караткевіч… Усе — маладыя, але ўжо знакамітыя…

Адпраўляючыся ў адпачынак, аматары бралі камеру. На экране — Камчатка, Далёкі Усход, Сібір, Алтай, а вось Мінска — лічаныя хвіліны. На экране — экзатычны базар недзе ў Сярэдняй Азіі, а роднай Камароўкі — ні кадра!..

Сярод нешматлікіх — фільм Уладзіміра Скакуна "Золотая осень в центре Мінска". А калі ж яго здымалі? На агароджы Чырвонага Касцёла — афіша: "Тыгры Маргарыты Назаравай у стужцы "Сёння новы атракцыён". Знайшлася газета "Вячэрні Міінск" з раскладам кінатэатраў — высветлілі: карціна тая дэманстравалася ў кастрычніку 1965 года. Таксама па афішы дазналіся, калі здымалі Паркавую магістраль з бульварам пасярэдзіне: гэта май 1970-га — менавіта тады размяшчаўся тут чэшскі луна-парк.

"Беларусьфільмаўская" хроніка адлюстроўвала перамогі і "свершения". У снежні 1981 года кіначасопіс "Советская Белоруссия" ўключаў сюжэт працягласцю ў хвіліну аб адкрыцці Тэатра музкамедыі. Але як узнікла пабудова? На яе ўзвядзенне саюзны бюджэт сродкаў не выдзяляў! А вось на рэканструкцыю чагосьці — калі ласка. І тады беларусы папрасілі грошай на рэканструкцыю… ДК тонкасуконнага камбіната. Зараз увесь былы ДК суконшчыкаў — касавы вестыбюль і частка фае Музычнага тэатра. А вось як ператваралі сціплы ДК — на кадрах тых жа васьмі міліметраў…

Другая тэма аматараў:

Падзеі

Штогод па восені збіраецца трупа Купалаўскага тэатра — ці не адзіная магчымасць убачыць майстроў сцэны разам. І, сярод іншага, менавіта гэтую падзею цягам двух дзесяцігоддзяў здымаў Генадзь Давыдзька. На экране — народныя, заслужаныя артысты БССР і СССР Галіна Макарава, Здзіслаў Стома, Тацяна Аляксеева, Стэфанія Станюта... Але вось некаторыя аблічча больш не мільгаюць, а з'яўляюцца малодыя Зоя Белахвосцік, Яўген Крыжаноўскі, сам Давыдзька… Стужкі пакуль алічбаваныя толькі часткова.

У красавіку 1970-га краіна адзначала 100-годдзе з дня нараджэння Леніна. Уладзімір Філіпёнак здымаў Мінск напярэдадні свята, калі горад спехам упрыгожвалі "нагляднай агітацыяй", а затым — 22-га, у дзень юбілею, і пасля, калі неактуальную ўжо аздобу здымалі. Зацікавілі некалькі камічных кадраў: напрыклад, у вітрыне цырульні — партрэт лысага правадыра…

Кінааматарства стала настолькі папулярным, што ў Мінску на праспекце, побач з крамай "Пад гадзіннікам", адкрылася крама "Кадр". Там прапаноўвалі ці не сем відаў камер, самай хадавой з якіх была "Кварц", падсветкі, мантажныя столікі, бачкі для апрацоўкі плёнкі, хімікаты. Камеры былі, а васьміміліметровую плёнку для іх не выпускалі. Аматары куплялі рулончыкі 16 мм і спецыяльным нажом, у цемры, разразалі ўздоўж, атрымліваючы дзве катушкі васьміміліметровай.

Асабліва шмат плёнкі назапашвалі для рэалізацыі трэцяй тэмы:

Падарожжы

1970-я: некалькі секунд рэпетыцыі балета; вось артысты на суботніку — мятуць смецце вакол тэатра; вось яны на гастролях у Індыі… Стоп! Што за сівы высакародны стары? Святаслаў, сын славутага мастака Мікалая Рэрыха! На сценах дома — карціны з "Індыйскага цыкла", у двары — ахвярнік, дзе па завяшчанні спалілі цела мастака…

Святаслава Рэрыха здымала кінахроніка, калі ён неаднойчы прыязджаў у СССР. Але вось гэтыя няпоўныя тры хвіліны паказваюць нам вучонага ў Індыі, у сваім радзінным доме, дзе шмат гадоў тварыў і памёр яго вялікі бацька.

20-гадовы кампазітар Эндру Лойд Вэбер напісаў рок-оперу "Ісус Хрыстос — суперзорка". На пачатку 1970-х яе "круцілі" радыёстанцыі свету. У СССР — "глушылкі", пачуць штосьці было немагчыма. Але, аказваецца, неяк жа і тут "пракалупалі" дзюры ў "жалезнай заслоне". Сведчанне — на васьмі міліметрах. Летам 1973-га ў Жыгулях адкрываецца злёт турыстаў. Чатыры хвіліны здымак — прадстаўленне каманд. Адна з іх распачынае шэсце: юнакі нясуць крыж з распятым чалавекам, на аголенай грудзі якога — надпіс па-англійску: "Так — міру, не — вайне!". Удзельнікі сведчылі, што з магнітафонаў гучала менавіта музыка рок-оперы — без эфірных перашкод! На шчасце, матэрыял не трапіў на вочы ідэолагаў: за лозунг хіпі мелі б буйныя непрыемнасці і "распяты" персанаж, і тыя, хто здымаў, і тыя, хто "прытупіў пільнасць"!

Аматары пачалі асвойваць колер. Узяў у паход у Саяны каляровую стужку і Валодзя Скакун. Тое, што ацалеў апошні ў яго жыцці матэрыял, можна лічыць цудам. Напрыканцы сакавіка 1971 года ў Саянах загінула пад лавінай беларуская каманда — усе дзевяць чалавек! Прычым усе — майстры спорту ці разраднікі… Падрабязнасці трагедыі рэканструявалі па каравых нататках і кінаплёнках. Адзнятая плёнка і тая, недавыкарыстаная, што заставалася ў камеры Валодзі, — праляжалі пад пластом таючага снега з сакавіка да чэрвеня, калі адкапалі нябожчыкаў… Апрацаваныя плёнкі паплечнікі праглядваюць кожны год у дату трагедыі, пасля наведання іх пахавання на Чыжоўскіх могілках. Сябры старэюць, а тыя на экране ў 1971-м — такія ж маладыя, вясёлыя за пару дзён да сыходу ў невараць.

З'явілася і плёнка, якая пры адпаведнай апрацоўцы давала адразу пазітыў, — зручна! Але гэта ж быў адзіны экзэмпляр, які непазбежна рваўся-склейваўся, шкрабаўся, скручваўся. Адсюль — якасць матэрыялу, што дайшоў да сёння.

Вось на такой стужцы ў 1962-м была знята гульня ў валейбол. Пад Ялтай, у горным спецсанаторыі для лётчыкаў, ці то не было валейбольнай сеткі, ці ўвогуле пляцоўкі. "Летуны" спускаліся да адпачываючых мінчан, каб пагуляць. Аднойчы ў каманду папрасіўся… Юрый Гагарын. Сёння яны не маюць цаны, гэтыя паўтары хвіліны стужкі, дзе "рэжацца" ў валейбол чалавек, які за год да таго першым паляцеў у космас…

Выдаткі на кінааматарства былі не нашмат большыя, чым на фатаграфію. Але менавіта фотаапаратамі шчоўкалі ў краіне ўсе, ад малога да старога. Чаму? Кіно ж — больш эфектнае! А спрацоўваў такі фактар: здымак можна было насіць у партманэ, уклеіць у альбом, падпісаць і прэзентаваць, уставіць у рамку, пакласці пад шкло вітража, глядзець у які заўгодна час, паказваць. Для дэманстрацыі ж кінароліка патрэбны цёмны пакой, белы экран, электрычнасць, праектар і чалавек, які можа ім кіраваць. Кінааматары ядналіся ў клубы, дзе абменьваліся апаратурай, парадамі, спрабавалі выдаваць газету, асмельваліся запрашаць майстроў "вялікага" кіно. Зіновій Герт агучыў аматарскі фільм будучага прафесійнага ВГИКаўскага аператара Марка Трахтмана "Доброе утро, горы снежные!".

І ўжо самадзейных кінематаграфістаў вабілі інсцэніроўкі. Ім здавалася, маўляў, што можа быць прасцей: вось камера, святло, артысты — сям'я, сябры, — сцэнарый накідваўся лёгка, астатняе, былі ўпэўнены, народзіцца "ў працэсе"!

Яшчэ кірунак аматарства —

Сюжэтнае кіно

Амаль усе "акцёрскія" стужкі прэтэндуюць на камедыі. Гэта фільмы з "хохмамі", а таксама парадыйныя дэтэктывы — нямыя, са "шпіёнскай" музыкай. Прадукцыю паказвалі гасцям, суправаджаючы "жывым" каментарыем. Цікава гэта было толькі ўдзельнікам здымак ды вось цяпер — праз паўстагоддзя — нам. А раптам адкрыецца нешта? І, паверце, — адкрываецца!

Фільм 1966 года — сатыра: параўноўваюцца ўмовы ў радавым санаторыі і ў "закрытым", генеральскім. Закадравы тэкст "а-ля Зіновій Герт" пісаў філосаф Лебедзеў — ён жа рэжысёр, аператар і мантажор, — а голас "ад аўтара" — цяперашні акадэмік Сцёпін. Яны ж былі і акцёрамі. І яшчэ двое акцёраў — Леў Тамільчык і Альберт Шкляр. "Квартэт" "фізікаў" і "лірыкаў" — удзельнікі і наступнай карціны таго ж года "Гордзіеў санвузел". Зразумела нават з назвы: камедыя. Персанаж трымае газету "Известия" за 13 студзеня 1966 года з артыкулам "Перевёртыши". Хто ж яны, шчыра адмоўныя ў савецкім грамадстве тыпы, якіх так абазвалі? Артыкул бэсціў антысавецкую дзейнасць пісьменнікаў Даніэля і Сіняўскага. І хаця яны, як пісалася, "палахліва схаваліся" пад псеўданімамі Мікалай Аржак і Абрам Тэрц, але чэкісты сарвалі маскі з "ачарніцеляў рэчаіснасці"!.. Газету хлопцы ўзялі не выпадкова. І няхай гэтая "фіга ў кішэні" застанецца хоць у гісторыі кінааматарства.

■■■

Сёння кінааматарства — менавіта "кіна-" — не існуе. Яго пахавала відэа і простая, даступная нават дзетсадаўцам, магчымасць фіксаваць падзеі на мабільны тэлефон. Васьміміліметровыя камеры адыходзяць у музей XX стагоддзя…

На жаль, трэба прызнаць: старыя рукапісы, творы мастацтва, побыту, архітэктуры, як мы ні спрабуем іх захоўваць, знікаюць — з кожным годам налічваецца іх усё менш. Знішчаюць іх — са зла ці незнарок — людзі. Сям'я Валерыя Лебедзева ў Бостане пераязджала з кватэры на кватэру. Жонка філосафа-кінааматара, перабіраючы рэчы, палічыла непатрэбнымі ў новым жытле старыя мінскія плёнкі — і скрыня з катушкамі апынулася на сметніку… Гаспадар, вярнуўшыся, выпадкова заўважыў іх адсутнасць — і кінуўся на двор, нырнуў у смецевы бак, памерам у два кубаметры, стаў перабіраць… Знайшоў! Ледзь вылез з бака, як пад'ехаў смецевоз…

Няўмольна знішчаюць рарытэты войны, стыхія і… бязлітасны час. Той жа лёс — у кінаплёнкі. Тэрмін яе "жыцця" — паўстагоддзя. Адзнятае ў 1950 — 1970-я карабаціцца, рассыпаецца ў прах, склейкі рассыхаюцца, і ўжо хутка немагчыма будзе алічбаваць асуджаныя на знікненне васьміміліметровыя стужкі. Самы час занепакоіцца!..

Самы час.

На кадрах аматараў: Рыгор Барадулін...

...Васіль Быкаў...

...Яўген Глебаў...

Кадр з аматарскага фільма.

Кадр з фільма "Чакай мяне...".

Кадр з фільма "Песімістычная камедыя".

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Рака часу"** (у рамках праекта "Нашы калекцыі") — звыш 70 твораў тыражнай і арыгінальнай графікі — да 1 верасня.
- Выстаўка аднаго твора: карціна М.Казакевіча **"Рэквіем"** (у рамках праекта "Нашы калекцыі") — да 18 жніўня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".**
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".**
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Персанальная выстаўка **Аляксандра Рыжэўскага,** майстра разьбы па шкарлупіне яйка.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".**

Выстаўкі:
- Міжнародны праект **"Рэчы паміж жыццём і смерцю"** — да 21 верасня.
- Выстаўка **"О доблестях, о подвигах, о славе"** — да 21 верасня.
- Выстаўка **"Манеты Другой сусветнай вайны"** (са збору Калінінградскага абласнога гісторыка-мастацкага музея) — да 29 жніўня.
- Выстаўка **"Памяці Мінскага гета"** (афорты Лазара Рана з прыватнай калекцыі) — да 12 жніўня.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка карцін і асабістых рэчаў Віктара Цітова **"Мастацтва, абпаленае вайной"** — да 31 ліпеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Беларусь сакральная"** — да 27 ліпеня.
- Выстаўка фотаапаратаў **"Настальгія"** — да 31 ліпеня.

Ратуша
- Пастаянная экспазіцыя.

Інфармацыйна-касавы цэнтр
- Выстаўка **"Смак беларускай гісторыі"** — да 31 ліпеня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.

Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка фатаграфій **"Мір стары — Мір новы".**

Слановая зала
- Выстаўка з прыватнай калекцыі І.Сурмачэўскага **"Дух часу і раскошы: мода і стыль 1820 — 1920-х гадоў"** — да 15 жніўня.

Партрэтная зала
- **"Выстаўка партрэтаў князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** (Германія) — да 16 лістапада.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
- **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
- Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўкі:
- Выстаўка да 90-годдзя нявесткі Якуба Коласа, дачкі Янкі Маўра, **Наталлі Міцкевіч**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўка:
- Ізраільская выстаўка **"Хаім Нахман Бялык: шлях паэта"** — да 12 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.

- **"Back in BSSR / Ізноў у БССР"** (савецкі плакат 1940 — 1980-х гг., прадметы матэрыяльнай культуры) — да 14 верасня.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска:

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл.Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганараваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:
- Карціна Уладзіміра Пасюкевіча **"Партрэт героя..."** (жывапісны партрэт, а таксама рэдкія ўзнагароды і дакументы ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны М.Савіцкага).
- Персанальная выстаўка фотаздымкаў Юрыя Іванова **"Па-за часам"** — да 3 жніўня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл.Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:
- Выстаўка гістарычнага партрэта Юрыя Каралевіча **"Рэмінісцэнцыя".**

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

Выстаўка:
- **"Куфэрак: стагоддзе прыгажосці"** — рэканструкцыя касцюмаў XIX ст. — да 28 верасня.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49. Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**

Выстаўкі:
- Выстаўка жывапісу і роспісу па тканіне **"Кобрынская палітра"** — да 9 жніўня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- **"Цмокі і васковыя фігуры"** (скульптуры драконаў і герояў фэнтазі, а таксама гістарычныя персанажы царскай сям'і Раманавых) — да 31 жніўня.
- Выстаўка франтавых лістоў салдатаў Вялікай Айчыннай, што падарылі нам Перамогу, — **"Праўда салдацкіх трохкутнікаў"** — да 27 ліпеня.
- Скарбы сусветнага жывапісу ва ўнікальнай калекцыі рэпрадукцый **Надзеі Лежэ** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь — да 7 верасня.
- Выстаўка-калекцыя самых прыгожых і знакамітых матылькоў свету **"Лятаючыя кветкі"** — да 17 жніўня.
- Выстаўка **праваслаўных ікон** прападобнага Сергія Раданежскага (са збору Гомельскай епархіі) — да 4 жніўня.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Кнігі, у якіх захоўваецца час..."** (лепшыя выданні сяр. XVII — пач. XX стст.) — да 27 ліпеня.
- **"Класікі беларускага мастацтва".**

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**
- Лакальная экспазіцыя **"Ваенна-санітарны вагон"** — да 30 верасня.
- Выстаўка да 100-годдзя Першай сусветнай вайны **"Вялікая вайна"** — да 28 ліпеня.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст.".**
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнавальная праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
- **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
- Выстаўка **"Як жылі нашы продкі".**
- Выстаўка **"Чарадзейны Куфар".**
- Выстаўка творчых работ выпускнікоў і выкладчыкаў мастацкай школы **"Сустрэча пакаленняў".**
- Персанальная выстаўка П.Цімафеева **"Драматычнасць сярэдняга плана. Час жывых".**
- У рамках праекта "Выток Нёмана — выток духоўнасці" — калектыўная выстаўка **"Абуджэнне".**
- Выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці А.Чуўюравай (Сярко) **"Частка маёй душы".**
- **"Вайны свяшчэнныя старонкі"** — выстаўка, прысвечаная Вялікай Перамозе.
- Фотавыстаўка С.І. Котава **"Праўнукі Перамогі".**

ЛІДСКІ ЗАМАК

- Камера катаванняў.
- Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі".**
- Партрэтная галерэя вялікіх князёў і каралёў.
- Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка".**
- Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага Княства".**

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 288 15 49.

- Персанальная выстаўка **Мікалая Бандарчука** — да 6 жніўня..
- Выстаўка **"Свая ігра"** Ніны Кавалёвай — да 6 жніўня.
- Выстаўка да 85-годдзя **Ірыны Елатамцавай** — да 6 жніўня.
- Выстаўка **"Партрэт стагоддзя"** членаў Саюза мастакоў Літвы, прысвечаная 300-годдзю з дня нараджэння Крысціёнаса Данелайціса, — да 6 жніўня.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 327 60 81.

- **27, 28 — "Паўлінка"** Янкі Купалы.

ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыя

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН

Аглядальнікі рэдакцыі:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Спецкарэспандэнты:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Вольга НАВІЦКАЯ

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — **Юрый ІВАНОЎ**

Мастацкі рэдактар — **Наталля ОВАД**

Карэктар — **Інга ЗЕЛЬГІС**

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by

E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2014. Індэксы 63875, 638752 Рознічны кошт — па дамоўленасці. Наклад 6316 Падпісана ў друк 25.07.2014 у 15.20 **Замова 2921**

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

УВАГА! / ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752